**В. В. ДАНІЛОВІЧ**

# "МОЛАДЗЬ У ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ, САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ І КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)"

Сярод найбольш складаных і супярэчлівых перыядаў беларускай гісторыі 1921–1939 гг. займаюць адно з цэнтральных месцаў. У гэты час у Савецкай Беларусі адбываліся карэнныя грамадска-палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні. Пабудова сацыялістычнага грамадства суправаджалася не толькі рэвалюцыйнымі ўзрушэннямі і пераменамі, але і абвастрэннем сацыяльна-палітычнага становішча. У складаных крызісных умовах 1920-х гг. кіраўніцтва ССРБ умацоўвала саюзныя адносіны з РСФСР і іншымі савецкімі рэспублікамі. Шырокі грамадска-палітычны аб'яднальны рух завяршыўся ўтварэннем 30 снежня 1922 г. Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Унутрыпалітычная барацьба, сацыяльна-эканамічная і культурная перабудова ўсяго ладу жыцця не абышліся без рэпрэсій па палітычных матывах. Разам з тым, нягледзячы на ўсе складанасці і перашкоды, ваенна-палітычны, сацыяльна-эканамічны і культурны патэнцыял савецкіх рэспублік, у тым ліку і БССР поступова ўзмацняўся.

У маштабнай перабудове грамадства ў 1920–1930-х гг. актыўна ўдзельнічала моладзь. Шмат у чым яна з'яўлялася ініцыятарам пераўтварэнняў, спадзяючыся, што будаўніцтва новага ладу жыцця адкрые выразную перспектыву для яе памкненняў. У краіне была разгорнута шырокая ідэйна-палітычная і адукацыйна-культурная работа. Гэта дазволіла актывізаваць працоўную і сацыяльную актыўнасць маладых грамадзян, якія ў выніку атрымалі адукацыю, дамагліся росту сацыяльнага і культурнага дабрабыту. Большая частка моладзі жыла з верай у лепшую будучыню, у яе свядомасці падтрымлівалася і ўмацоўвалася «пачуццё адзінай сям'і». Неад'емным сімвалам новага часу стала імкненне маладых людзей да стваральнай працы, новых дасягненняў і рэкордаў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, развіцці навукі і тэхнікі, культуры і адукацыі, умацаванні абараназдольнасці краіны. Моладзь, аб'яднаная ідэяй будаўніцтва справядлівага ладу жыцця, дэманстравала шматлікія прыклады працоўнага гераізму і самаахвярнасці. Дзякуючы гэтаму ў 1920–1930-х гг. быў створаны трывалы падмурак новага грамадства.

**"Гістарыяграфія і крыніцы"**. Гістарыяграфія па праблеме ўдзелу моладзі ў будаўніцтве і станаўленні Савецкай Беларусі даволі значная. За 20-я гг. XX – пачатак XXI ст. назапашаны велізарны пласт літаратуры, якая ў рознай ступені адлюстроўвае гістарычныя факты і падзеі, звязаныя з дзейнасцю маладзёжных арганізацый БССР у перыяд, што даследуецца намі.

Першыя працы, у якіх закранаўся шэраг аспектаў удзелу юнакоў і дзяўчат у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг., з'явіліся ўжо ў 20–30-я гг. XX ст.

Так, актуальныя задачы, ход іх выканання, а таксама пэўны аналіз дасягненняў і праблем дзейнасці камсамола БССР адлюстраваны ў выданнях, прымеркаваных адпаведна да яго з'ездаў і пленумаў[1]. Асобна выдадзеныя публікацыі былі прысвечаны

[1] Тезисы докладов к VIII-му Всебелорусскому съезду ЛКСМБ. Зборнік. – Минск: [б. и.], 1926. – 63 с.; Панцюхоў, М. Р. ЛКСМБ на павароце. Даклад на студзеньскім Пленуме ЦК ЛКСМБ аб выніках абследваньня работы комсамолу Беларусі, праведзенага ЦК УсеЛКСМ / М. Р. Панцюхоў. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва,

пытанням ажыццяўлення камсамолам рэспублікі сельскагаспадарчай[2] і побытавай працы[3], антырэлігійнай барацьбы[4], а таксама дзейнасці такой грамадскай маладзёжнай ініцыятывы як “лёгкая кавалерыя”[5].

Некаторыя выданні адлюстроўваюць сацыяльна-эканамічнае становішча рабочай моладзі[6], удзел маладога пакалення ва ўдасканаленні працы тэхнікумаў[7], а таксама маладзёжныя ініцыятывы па паляпшэнні сацыяльнага становішча юнакоў і дзяўчат[8].

Асаблівае месца займае манаграфія Б. Олікера і Л. Розенблюма “Нарысы па гісторыі комсамолу Беларусі”[9], якая па-сутнасці з’яўляецца першай спробай асэнсавання стварэння і працы саюза. Яе аўтары разглядалі яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі Югенд-бунд і Югенд-ферэйн як папярэднікаў і аснову камсамола Савецкай Беларусі, лічылі мінімальнай ролю кампартыі ў стварэнні саюза і кіраўніцтве ім. Таму пленум ЦК ЛКСМБ у 1931 г. прызнаў дадзеную кнігу ідэйна варожай, такую адзнаку пацвердзіла і КП(б)Б на XIV з’ездзе ў 1932 г.[10] Аднак сучасны аб’ектыўны навуковы аналіз архіўных дакументаў і матэрыялаў у значнай ступені пацвярджае слушнасць шэрага высноў Б. Олікера і Л. Розенблюма.

Тым не менш адмоўная рэакцыя на іх працу прывяла да таго, што чарговая спроба пэўнага абагульнення вопыту дзейнасці камсамола Савецкай Беларусі была зроблена толькі ў 1940 г., калі выйшла даволі аб’ёмная гістарычная даведка “Дваццаць год Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі”[11], якая ўтрымлівае звесткі па розных кірунках дзейнасці саюза.

Увогуле каштоўнасць выданняў 20–30-х гг. XX ст. заключаецца ў тым, што яны напісаны па гарачых слядах падзей, перадаюць атмасферу тых гадоў, утрымліваюць

---

1930. – 42 с.; Сянкевіч, А. Работа ЛКСМБ і задачы парткіраўніцтва: даклад на студзеньскім пленуме ЦК КП(б)Б / А. Сянкевіч. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930. – 32 с.; Шоламаў, Е. Работа ЛКСМБ па нацыянальна-культурным будаўніцтве / Е. Шоламаў. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930. – 48 с.; Палякоў, М. Справаздача Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ на X з’ездзе / М. Палякоў. – Менск: Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, 1931. – 80 с.; Тэзісы да дакладу т. Рубенчыка аб нац.-культ. будаўніцтве на X з’ездзе ЛКСМБ. – Менск: ЦК ЛКСМБ, 1931. – 11 с.; Герцовіч, Л. Б. За большэвізацыю ЛКСМБ / Л. Б. Герцовіч. – Менск: Партвыдавецтва, 1933. – 32 с.; Аўгустайціс, А. В. Пад сцягам партыі Леніна–Сталіна да новых перамог: справаздачны даклад ЦК на XI з’ездзе ЛКСМБ 13 сакавіка 1936 г. / А. В. Аўгустайціс. – Менск: Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1936. – 33 с.; Конік, Ю. Д. Па-сталінску арганізаваць палітычнае выхаванне моладзі: выступленне на з’ездзе 14 сакавіка 1936 г. / Д. Ю. Конік. – Менск: Белпартвыд ЦК КП(б)Б, 1936. – 20 с.

[2] Комсамолец за плугам. Зборнік гутарак. – Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1925. – 192 с.; Свенціцкі, А. М. У паход за павышэнне і ахову соцураджаю / А. М. Свенціцкі. – Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1934. – 29 с.

[3] Шамшур, П. У чалавечым лёсе. Пра бытавую работу комсамолу / П. Шамшур. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1929. – 50 с.

[4] Клібанаў, А. Камсамол на фронце бязбожніка. Як весці камсамолу антырэлігійную прапаганду / А. Клібанаў. – Мінск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930. – 96 с.

[5] “Лёгкая кавалерыя” – Менск: Беларускае дзаржаўнае выдавецтва, 1930. – 76 с.

[6] Дихтяр, С. Р. Рабочая молодежь Белоруссии. Численность, состав, быт, условия труда и физическое состояние (по материалам медико-санитарного обследования 1925 г.) / С. Р. Дихтяр, Б. Я. Смулевич, Д. Л. Эйнгорн. – Минск: Беларуская медычная думка, 1926. – 156 с.

[7] Чырвоны тэхнік. Прысвячаецца 10-ай гадавіне пралетарскага студэнцтва БССР. – Менск: Політэхнікум, 1929. – 56 с.

[8] Найштат, А. Комуны моладзі / А. Найштат, І. Рыўкін, І. Саснавік. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1931. – 76 с.; Алесін, Т. У барацьбе за культурнае заможнае жыццё / Т. Алесін. – Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1934. – 40 с.

[9] Олікер, Б. Нарысы па гісторыі комсамолу Беларусі / Б. Олікер, Л. Розенблюм. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1927. – 294 с.

[10] Журов, А. Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии (1918 – 1925 гг.) / А. Журов. – Минск: Беларусь, 1970. – 216 с.

[11] Дваццаць год Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі / Склад.: І. Ефройкін і інш. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1940. – 118 с.

значны фактычны матэрыял. Аднак у сваёй большасці гэта літа- ратура носіць агітацыйна-прапагандысцкі характар. Яе аўтары не ставілі мэты глыбокага і ўсебаковага раскрыцця форм і метадаў працы камсамола, дзейнасці маладога пакалення ў розных сферах жыцця грамадства.

Больш глыбокае даследаванне гісторыі камсамола Савецкай Беларусі пачалося толькі з другой паловы 1950-х гг. У выніку да канца 80-х гг. XX ст. быў апублікаваны шэраг прац па гэтай тэматыцы.

З іх перш за ўсё неабходна адзначыць працы А. Журава[12], у якіх адлюстраваны працэс стварэння камсамольскіх арганізацый Савецкай Беларусі, іх аб'яднанне, роля ў грамадска-палітычным і культурным жыцці, гаспадарчым будаўніцтве, раскрыты формы і метады кіравання кампартыяй камсамолам.

Удзел камсамола Савецкай Беларусі ў гаспадарчым аднаўленні адлюстраваны М. Шклярам[13], у правядзенні масавай калектывізацыі –А. Бабчынскім[14], у стварэнні навучальных установ працоўных рэзерваў для падрыхтоўкі кадраў рабочых – Я. Мазуравай[15]. Некаторыя аспекты ўдзелу саюза ў дзяржаўным будаўніцтве 1921–1939 гг. прадстаўлены ў працы Г. Жуковіч[16], якая храналагічна ахоплівае 20-я – 60-я гг. XX ст.

Шэраг пытанняў шэфства камсамола Савецкай Беларусі над Балтыйскім флотам даследавалі А. Петрашкевіч і С. Елісаў[17]. Праблеме ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі ў гады трэцяй пяцігодкі прысвечана манаграфія П. Чыгрынава[18].

Падборка лічбавых і фактычных даных па гісторыі камсамола Савецкай Беларусі прадстаўлена ў выданні "Комсомол Белоруссии. Цифры и факты"[19].

Знакавай з'явай у даследаванні гісторыі беларускага камсамола ад утварэння і да сярэдзіны 70-х гг. XX ст. стала калектыўная манаграфія "Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии"[20]. У ёй разгледжаны кірункі дзейнасці саюза, прыведзены цікавыя факты, асобныя выніковыя даныя. Аднак шматпланавасць працы і яе шырокія храналагічныя рамкі не дазволілі падрабязна і глыбока прааналізаваць дзейнасць камсамола Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг.

Праблемы развіцця маладзёжнага друку ў Савецкай Беларусі першай паловы 1920-х гг. знайшлі адлюстраванне ў манаграфіі А. Слукі[21].

---

[12] Жураў, А. Е. Комсамол Беларусі ў барацьбе за соцыялізм (1918–1941 гг.) / А. Е. Жураў. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1957. – 76 с.; Журов, А. Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии (1918–1925 гг.) / А. Журов. – Минск: Беларусь, 1970. – 216 с.; Жураў, А. Я. У баях народжаны. Кароткі нарыс гісторыі камсамола Беларусі / А. Я. Жураў. – Выд. 2-е. – Мінск: Народная асвета, 1970. – 221 с.

[13] Шкляр, М. Комсамол Беларусі ў перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі (1921–1925 гг.) / М. Шкляр. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1958. – 31 с.

[14] Бабчынскі, А. І. Комсамол Беларусі ў гады колектывізацыі сельскай гаспадаркі (1929–1934 гг.) / А. І. Бабчынскі. – Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1958. – 40 с.

[15] Мазурова, Я. Комсомол и подготовка рабочих в системе трудовых резервов. Очерки / Я. Мазурова. – Минск: Беларусь, 1964. – 297 с.

[16] Жукович, Г. С. Участие комсомола в государственном управлении / Г. С. Жукович. – Минск: Наука и техника, 1969. – 116 с.

[17] Петрашкевич, А. Шеф краснознаменной Балтики / А. Петрашкевич, С. Елисов. – Минск: Государственное издательство БССР, 1963). – 98 с.

[18] Чыгрынаў, П. Да абароны Радзімы. Дзейнасць камсамола Беларусі па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі ў гады трэцяй пяцігодкі (1938 – чэрвень 1941 гг.) / П. Чыгрынаў. – Мінск: Беларусь, 1973. – 126 с.

[19] Комсомол Белоруссии. Цифры и факты / Текст подгот. П. Чигриновым. – Минск: Беларусь, 1968. – 78 с.

[20] Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии / А. Е. Журов [и др.]; под ред. А. Е. Журова [и др.]. – Минск: Беларусь, 1975. – 536 с.

[21] Слука, О. Г. Голос революционной молодежи: проблемы становления и развития молодежной печати Белоруссии / О. Г. Слука. – Минск: Издательство БГУ, 1978. – 141 с.

У даследаванні У. Навіцкага і Я. Новіка[22] абагулены вопыт работы камсамола краю па развіцці народнай адукацыі ў міжваенны перыяд.

Пэўныя звесткі аб дзейнасці камсамола і несаюзнай моладзі Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. прадстаўлены таксама ў працах М. Шкляра, І. Ільюшына і С. Умрэйкі, Р. Кісялёва, С. Лагуна, М. Красоўскага, Г. Герасіменкі, Я. Шкляр, У. Іванова, В. Сафонавай, У. Вышынскага і П. Петрыкава, Я. Новіка, Н. Васілеўскай, Л. Дразда, М. Максімавай[23]; у калектыўных манаграфіях "Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі"[24], "Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905 – 1969)"[25], "Школа мужества и патриотизма. Краткий очерк истории ДОСААФ Белорусской ССР"[26] і інш.

Некаторыя звесткі па праблеме ўтрымліваюцца ў такім маштабным калектыўным даследаванні як "Гісторыя Беларускай ССР" (тамы 3 і 4)[27].

Праблематыка шэрага кірункаў дзейнасці камсамола Савецкай Беларусі знайшла адлюстраванне ў кандыдацкіх дысертацыях А. Бабчынскага, М. Капітонавай, С. Дахія, П. Чыгрынава, Р. Ермашкевіча, І. Каменскай, У. Навіцкага, Я. Піульскага, С. Альшэўскай, У. Медзяніка, Д. Хромчанкі[28].

---

[22] Новицкий, В. И. Участие Ленинского комсомола Белоруссии в борьбе за подъем народного образования (1920 – июнь 1941 гг.) / В. И. Новицкий, Е. К. Новик. – Минск: Наука и техника, 1979. – 269 с.

[23] Василевская, Н. В. Формирование производственно-технической интеллигенции БССР. 1921–1941 гг. / Н. В. Василевская. – Минск: Наука и техника, 1986. – 157 с.; Герасименко, Г. Г. Деятельность компартии Белоруссии по вовлечению трудящихся масс в управление государством (1925–1937 гг.) / Г. Г. Герасименко. – Минск: Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1973. – 228 с.; Дрозд, Л. Н. Развитие средней общеобразовательной школы в Белоруссии, 1917–1941 / Л. Н. Дрозд. – Минск: Народная асвета, 1986. – 160 с.; Іваноў, У. М. Нарыс дэмаграфіі, сацыялогіі і быту рабочага класа Савецкай Беларусі (1917–1941 гг.) / У. М. Іваноў. – Мінск: Вышэйшая школа, 1975. – 158 с.; Ильюшин, И. М. Народное образование в Белорусской ССР / И. М. Ильюшин, С. А. Умрейко. – Минск: Учпедгиз БССР, 1961. – 439 с.; Кісялёў, Р. Я. Школа Савецкай Беларусі / Р. Я. Кісялёў. – Мінск: Народная асвета, 1968. – 188 с.; Красовский, Н. И. Высшая школа Советской Белоруссии. История, события, факты / Н. И. Красовский. – Изд. 2-е. – Минск: Вышэйшая школа, 1972. – 328 с.; Лагун, С. Р. Укрепление Советов Белоруссии и повышение их роли в строительстве социализма / С. Р. Лагун. – Минск: Наука и техника, 1970. – 304 с.; Максимова, Л. П. Ложные друзья молодежи: из истории борьбы Коммунистической партии и комсомола Белоруссии с троцкизмом за молодежь / Л. П. Максимова. – Минск: Общество "Знание" БССР, 1988. – 26 с.; Новик, Е. К. Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917–1941 гг.) / Е. К. Новик. – Минск: Наука и техника, 1981. – 294 с.; Сафонова, О. В. Культурное строительство в белорусской деревне в период построения социализма (1926–1937 гг.) / О. В. Сафонова. – Минск: Наука и техника, 1978. – 100 с.; Шкляр, Е. Н. КПБ – организатор социалистического соревнования в промышленности республики (1926–1941 гг.) / Е. Н. Шкляр. – Минск: Издательство БГУ, 1974. – 272 с.; Шкляр, М. Е. Борьба Компартии Белоруссии за укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в восстановительный период (1921–1925 гг.) / М. Е. Шкляр. – Минск: Государственное издательство БССР, 1960 – 347 с.

[24] Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / Навукова-даследчы інстытут педагогікі Міністэрства асветы БССР; рэдкал.: С. А. Умрэйка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Народная асвета, 1968. – 621 с.

[25] Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969) / Л. П. Липинский [и др.]; под. ред. И. Н. Макарова. – Минск: Беларусь, 1970. – 474 с.

[26] Школа мужества и патриотизма. Краткий очерк истории ДОСААФ Белорусской ССР / [П. К. Максимов и др.]. – Минск: Беларусь, 1988. – 270 с.

[27] Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, – Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.) / І. Я. Марчанка [і інш.]. – 1973. – 693 с.; Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, – Т. 4: Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.) / І. С. Краўчанка [і інш.] – 1975. – 639 с.

[28] Альшевская, С. И. Комсомол Белоруссии – активный помощник партии в культурном строительстве республики в годы второй пятилетки (1933–1937 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / С. И. Альшевская; Минский государственный педагогический ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1978. – 24 с.; Бабчинский, А. В. Комсомол – помощник Коммунистической партии в борьбе за коллективизацию сельского хозяйства (1930–1934 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / А. В. Бабчинский; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1956. – 15 с.; Дахия, С. Ф. Комсомол Белоруссии – верный помощник КП(б)Б в индустриализации республики (1926–1932 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / С. Ф. Дахия; Ин-т истории партии при ЦК КПБ – филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск, 1971. – 22 с.; Ермашкевич, Г. И. Комсомол Белоруссии – помощник

Пэўныя напрамкі грамадска-палітычнага і сацыяльна-культурнага жыцця Савецкай Беларусі, звязаныя не толькі з камсамольскай, але і несаюзнай моладдзю, прадстаўлены ў кандыдацкіх дысертацыях В. Сафонавай, А. Слукі, В. Кушнера, М. Чудаева, В. Рудкіна, Н. Васілеўскай, А. Бендзіна[29].

Пачатковы этап узаемадзеяння камсамола і кампартыі на тэрыторыі Савецкай Беларусі быў абагулены ў доктарскай дысертацыі А. Журава[30], а пытанні развіцця камсамольскага друку на тэрыторыі Беларусі міжваеннага перыяду – у доктарскай дысертацыі А. Слукі[31]

Як бачна, з указанай намі праблематыкі найбольш даследаванымі ў савецкі перыяд пытаннямі з'яўляліся арганізацыя адукацыі юнага пакалення і ўклад у гэтую справу камсамола; станаўленне і развіццё маладзёжнага і камсамольскага друку; палітасветная дзейнасць камсамола ў 1921–1925 гг. і ў 1938–1939 гг.; узаемадзеянне камсамола і кампартыі ў 1921–1925 гг.; праца камсамола па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі, стварэнні і кіраўніцтве піянерскай арганізацыяй у 1921–1925 гг.; удзел камсамола ў аднаўленні народнай гаспадаркі, у індустрыялізацыі 1926–1932 гг.

партии в подготовке и воспитании кадров сельских механизаторов (1928–1937 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / Г. И. Ермашкевич; Министерство высшего и среднего специального образования Белорусской ССР, Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1972. – 25 с.; Каменская, И. В. Политико-просветительная работа комсомола Белоруссии в период восстановления народного хозяйства (1921–1925 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / И. В. Каменская; Минский государственный педагогический ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1973. – 30 с.; Капитонова, М. И. Деятельность комсомола Белоруссии по созданию и руководству пионерской организацией республики (1918–1925 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / М. И. Капитонова; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1970. – 18 с.; Медяник, В. И. Комсомол Белоруссии – активный помощник партии в организации социалистического соревнования на промышленных предприятиях республики в годы второй пятилетки (1933–1937 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / В. И. Медяник; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1978. – 24 с.; Новицкий, В. И. Участие комсомола Белоруссии в осуществлении культурной революции (1928–1932 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / В. И. Новицкий; Академия наук Белорусской ССР, Институт истории. – Минск, 1975. – 21 с.; Пиульский Е. В. Деятельность комсомола Белоруссии по военно-патриотическому воспитанию молодежи в годы первой пятилетки (1928–1932 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / Е. В. Пиульский; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1975. – 26 с.; Хромченко, Д. Н. Комсомол Белоруссии – активный помощник партии в коммунистическом воспитании молодежи в годы третьей пятилетки: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / Д. Н. Хромченко; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1985. – 20 с.; Чигринов, П. Г. Деятельность комсомола Белоруссии по военно-патриотическому воспитанию молодежи в годы третьей пятилетки (1938–1941 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.570 / П. Г. Чигринов; Институт истории партии при ЦК КП Белоруссии – филиал Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск, 1971. – 25 с.

[29] Бендин, А. Ю. Деятельность Компартии Белоруссии по идейно-политическому воспитанию студенческой молодежи (1928–1937гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / А. Ю. Бендин; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1989. – 22 с.; Василевская, Н. В. Формирование кадров производственно-технической интеллигенции БССР в период строительства социализма (1921–1937 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Н. В. Василевская; АН БССР, Ин-т истории. – Минск, 1982. – 18 с.; Кушнер, В. Ф. Военно-патриотическое воспитание и подготовка трудящихся Белоруссии к защите Родины (1921–1925 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / В. Ф. Кушнер; Минский государственный педагогический институт им. А. М. Горького. – Минск, 1976. – 25 с.; Рудкин, В. Г. Борьба с детской беспризорностью в БССР: 1921–1931 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / В. Г. Рудкин; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1981. – 21 с.; Сафонова, О. В. Культурное строительство в белорусской деревне в период построения социализма (1926–1932 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / О. В. Сафонова; Академия наук Белорусской ССР, Отделение общественных наук. – Минск, 1975. – 21 с.; Слука, О. Г. Молодёжная печать Белоруссии 1918–1925 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.580 / О. Г. Слука; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1971. – 24 с.; Чудаев, М. Ф. Организация и деятельность рабочих факультетов БССР (1920–1939 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / М. Ф. Чудаев; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1980. – 20 с.

[30] Журов, А. Е. Деятельность коммунистической партии Белоруссии по созданию и руководству ЛКСМБ (1918–1925 гг.): автореф. дис. ... докт. ист. наук: 07.00.01 / А. Е. Журов; Белорусский государственный ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1967. – 32 с.

[31] Слука, О. Г. Комсомольская печать Белоруссии: проблемы становления, развития и ее роль в строительстве социализма, 1918–1941 гг.: автореф. дис. ... докт. ист. наук: 07.00.10 / О. Г. Слука Олег Георгиевич; Ленинградский государственный ун-т им. А. А. Жданова. – Ленинград, 1986. – 42 с.

і арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на прамысловых прадпрыемствах у 1933–1937 гг., у культурным будаўніцтве 1928–1937 гг., у падрыхтоўцы кадраў сельскіх механізатараў у 1928–1937 гг. і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў 1929–1934 гг.

Аднак неабходна адзначыць, што гісторыя маладзёжнага руху ў савецкай гістарычнай навуцы даследавалася ў рамках гісторыі камуністычнай партыі, бо ён з канца 1920-х гг. фактычна быў прадстаўлены адным камсамолам, які з'яўляўся апорай і рэзервам кампартыі, а аснову яго дзейнасці складала выкананне яе ўказанняў. Маладзёжная праблематыка не вывучалася ў плане грамадзянскай гісторыі, а ў плане гісторыі кампартыі разглядалася, зыходзячы з палітыкі і пазіцый камуністаў.

Такі падыход істотным чынам адмоўна адбіўся на дакладнасці і аб'ектыўнасці даследавання юнацкага руху, разумення яго сутнасці, месца і ролі ў грамадстве. Так, некамуністычныя арганізацыі моладзі даследаваліся не як самастойная з'ява, а як адназначна чужародная альтэрнатыва камуністычнаму руху. Пэўныя гістарычныя працы па маладзёжным руху ўвогуле падладжваліся пад навуковы камунізм і, зразумела, тут пераважаў вузкі камуністычны ідэалагічны аспект.

У выніку адбыўся значны перакос у разглядзе дзейнасці камсамола і іншых юнацкіх арганізацый і неарганізаванай моладзі. У значнай ступені менавіта таму ў існуючай гістарыяграфіі праблематыка ўдзелу маладога пакалення ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі 1921–1939 гг. асветлена аднабакова, часткова і фрагментарна, адсутнічаюць комплексныя працы па гэтай тэматыцы.

Агульным недахопам гістарычных прац савецкага часу было імкненне не выходзіць за рамкі агульнапрынятых, фактычна запраграмаваных установак. Гэта непазбежна спараджала аднамернасць ацэнак, вяло да лакіроўкі і замоўчвання фактаў, якія не адпавядалі афіцыйнай кропцы гледжання.

Аналіз гістарыяграфіі савецкага перыяду па гісторыі маладзёжнага руху ў Савецкай Беларусі прыводзіць да высновы, што пісалася яна ва ўмовах панавання камуністычнай ідэалогіі і адпаведнай палітычнай цэнзуры, што не дазваляла ажыццявіць аб'ектыўны аналіз гістарычных падзей і фактаў, вяло да аднабаковага адлюстравання і скажэнняў сапраўднай карціны гістарычнага мінулага.

У гістарыяграфіі незалежнай Рэспублікі Беларусь пэўныя звесткі аб удзеле моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі знайшлі адлюстраванне ў такіх грунтоўных калектыўных працах, як "Гісторыя Беларусі" (том 5)[32], "ДОСААФ Республики Беларусь: люди, события, факты"[33], "Военная школа Беларуси: традиции и современность"[34]; у манаграфіях Г. Карзенкі, Р. Платонава, М. Бяспалай, І. Пушкіна, Б. Далгатовіча, А. Салаўянава, А. Кузюковіч[35] і інш. Асобна неабходна адзначыць манаграфію

[32] Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.] – 2006. – 615 с.

[33] Лебедев, П. А. ДОСААФ Республики Беларусь: люди, события, факты / П. А. Лебедев, Б. Д. Долготович, В. А. Орлов; под ред. П. А. Лебедева. – Минск: Парадокс, 2007. – 254 с.

[34] Военная школа Беларуси: традиции и современность / С. В. Бобриков [и др.]; под ред. Т. В. Беловой (глав. ред.) [и др.]. – Минск: Беларуская Энцыклапедыя, 2010. – 373 с.

[35] Бяспалая, М. А. Беларуская вёска ў першыя гады НЭПа (1921–1923 гг.) / М. А. Бяспалая. – Мінск: Беларускі ун-т культуры, 1999. – 253 с.; Бяспалая, М. А. Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады НЭПа (1921–1927 гг.) / М. А. Бяспалая. – Мінск: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, 2009. – 325 с.; Долготович, Б. Д. Объединенная белорусская военная школа – кузница кадров / Б. Д. Долготович. – Минск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011. – 127 с.; Корзенко, Г. В. Подготовка научных кадров в Беларуси. Взгляд сквозь годы / Г. В. Корзенко. – Минск: Белорусское издательское товарищество "Хата", 1998. – 166 с.; Кузюкович, А. П. Государственная политика здорового образа жизни в советской Беларуси в 1920–1930-е гг. / А. П. Кузюкович. – Минск: Бестпринт, 2017. – 214 с.; Платонаў, Р. П. Беларусь у міжваенны перыяд / Р. П. Платонаў.

І. Шаўчука[36], якая ўтрымлівае значны матэрыял па арганізацыі падрыхтоўкі навуковых кадраў у Савецкай Беларусі ў 20 – 30-я гг. XX ст. у сферы гуманітарных навук.

Акрамя таго асноўныя кірункі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў БССР у 1920-я гг., разгледжаны ў кандыдацкай дысертацыі і манаграфіі Н. Мусінай[37]. Аднак комплексна ўдзел моладзі ў грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных працэсах у рэспубліцы ў гэтых працах не прадстаўлены, бо аўтарам зроблены ўхіл на стварэнне сацыяльна-псіхалагічнага партрэта маладога пакалення.

Цалкам прысвечана праблеме беларускага нацыянальнага маладзёжнага руху ў другой палове XIX – 30-х гг. XX ст. праца У. Ляхоўскага "Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1939 г."[38] Гэта кніга ўтрымлівае шматлікія цікавыя звесткі па перыядзе 1921–1939 гг., але ў працы адсутнічае комплексны, усебаковы аналіз умоў і напрамкаў дзейнасці тагачасных беларускіх нацыянальных маладзёжных арганізацый, што, відавочна, тлумачыцца шырокімі храналагічнымі межамі, вызначанымі аўтарам.

Праблематыка абаронна-масавай працы грамадскіх арганізацый Савецкай Беларусі, у тым ліку камсамола, разгледжана ў манаграфіі Д. Хромчанкі "Оборонно-массовая работа общественных организаций Беларуси в 1920 – 1940-е годы"[39]. Аднак асноўную ўвагу аўтар аддаў дзейнасці абаронных таварыстваў.

Пытанні дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, сацыяльнай абароны моладзі, яе становішча ў сістэме адукацыі і прафсаюзах Савецкай Беларусі 1921 – 1930 гг. закрануты ў кандыдацкіх дысертацыях І. Раманавай, Н. Куракевіч, М. Сакалова, А. Салаўянава, А. Дубовік[40].

Некаторыя моманты ўдзелу юнацтва ў беларусізацыі і краязнаўчым руху БССР, а таксама становішча маладых палякаў у рэспубліцы закрануты ў кандыдацкіх

---

– Мінск:БелНДІДАС, 2001. – 282 с.; Пушкін, І. Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.) / І. Пушкін. – Магілёў: МДУ, 2004. – 167 с.; Пушкін, І. А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.) / І. А. Пушкін. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2010. – 319 с.; Пушкін, І. А. Грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Беларускай ССР (1919 – 1991) / І. А. Пушкін. – Магілёў: МДУХ, 2018. – 423 с.; Соловьянов, А. П. Социальная защита несовершеннолетних в БССР (1921–1930 гг.) / А. П. Соловьянов. – Минск: Беларуская навука, 2013. – 203 с.

[36] Шаўчук, І. І. Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады XX ст.) / І. І. Шаўчук. – Брэст: БрДУ, 2007. – 279 с.

[37] Мусина, Н. Е. Государсртвенная молодёжная политика в БССР в 20-е годы XX века: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Н. Е. Мусина; Белорусский государственный ун-т. – Минск, 2012. – 24 с.; Мусина, Н. Е. Государсртвенная молодёжная политика в БССР в 1920-е годы / Н. Е. Мусина. – Витебск: ВГМУ, 2015. – 147 с.

[38] Ляхоўскі, У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. Ляхоўскі. – 2-е выд. – Смаленск: Інбелкульт, 2015. – 480 с. с. 170.

[39] Хромченко, Д. Н. Оборонно-массовая работа общественных организаций Беларуси в 1920–1940-е годы / Д. Н. Хромченко. – Минск: БНТУ, 2017. – 204 с.

[40] Дубовік А. А. Дзейнасць прафсаюзаў Беларусі па рэгуляванні сацыяльна-працоўных адносін у перыяд НЭПа (1921–1929 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А. А. Дубовік; Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка. – Мінск, 2017. – 22 с.; Куракевіч, Н. І. Дзяржаўная палітыка ў галіне народнай адукацыі і падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў у Беларусі (1921–1930 гг.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / Н. І. Куракевіч; Беларускі дзяржаўны педагагічны ўн-т імя Максіма Танка. – Мінск, 2002. – 23 с.; Раманава, І. М. Фарміраванне савецкай сістэмы адукацыі ў БССР, 1921–1930 гг.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / І. М. Раманава; Нац. АН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 1999. – 19 с.; Соколов, М. Н. Студенчество высшей школы Беларуси 20-х годов XX века: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / М. Н. Соколов; Белорусский государственный педагогический ун-т им. М. Танка. – Минск, 2002. – 19 с.; Соловьянов, А. П. Социальная защита подростающего поколения в БССР (1921–1930 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А. П. Соловьянов; Нац. АН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2008. – 19 с.

дысертацыях Т. Баталкі, А. Дзянісава і В. Жука [41] . У доктарскай дысертацыі М. Бяспалай [42] прыведзены шэраг фактаў з жыцця і дзейнасці вясковай моладзі Савецкай Беларусі 1921–1927 гг.

Апублікаваны таксама шэраг артыкулаў, якія асвятляюць асобныя аспекты праблемы, што даследуецца намі.

Як бачна, у гістарыяграфіі незалежнай Рэспублікі Беларусь найбольш грунтоўна распрацаваны пытанні арганізацыі адукацыі юнага пакалення ў 1921– 1930 гг. і падрыхтоўкі навуковых кадраў, дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў БССР у 1920-я гг. Зроблены таксама значны, хоць і недастатковы, крок у справе даследавання дзейнасці беларускіх нацыянальных маладзёжных арганізацый у 1921–1939 гг.

Такім чынам, у гістарыяграфіі азначанай праблемы можна вылучыць 3 перыяды:

1) 1920–1930-я гг. – характарызуецца перавагай агітацыйна-прапагандысцкай літаратуры;
2) другая палова 1950-х – 1980-я гг. – больш глыбокае даследаванне гісторыі камсамола, аднак з захаваннем пэўных ідэалагічных абмежаванняў;
3) канец XX – пачатак XXI ст. – адыход ад ідэалагічных абмежаванняў і рост аб'ектыўнасці даследаванняў.

У цэлым аналіз гістарыяграфіі сведчыць, што да гэтага часу праблема ўдзелу юнацтва ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. не стала аб'ектам комплекснага і глыбокага даследавання. У навуковай літаратуры прадстаўлены асобныя сюжэты гэтай праблематыкі. Многія пытанні дзейнасці моладзі Савецкай Беларусі дадзенага перыяду застаюцца маладаследаванымі.

Вышэйзгаданае сведчыць аб неабходнасці грунтоўнай распрацоўкі і комплекснага аналізу праблемы ўдзелу моладзі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі 1921 – 1939 гг.

У раздзеле 1.2. *"Аналіз крыніц"* прааналізаваны комплекс крыніц па праблеме, даследаванню якой прысвечана дысертацыя. Крыніцавую базу даследавання склалі разнастайныя па характары і змесце дакументы і матэрыялы, якія ў сваёй сукупнасці даюць рознабаковае ўяўленне аб усім комплексе пытанняў праблемы ўдзелу моладзі ў будаўніцтве Савецкай Беларусі.

Пэўныя звесткі атрыманы са статыстычных даведнікаў, перыядычнага друку і зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, прысвечаных асобным пытанням праблемы, што даследуецца.

Карысныя матэрыялы і даныя, у першую чаргу па гісторыі камсамола Савецкай Беларусі, утрымліваюць камсамольскія даведачна-інфармацыйныя выданні як

---

[41] Баталко, Т. И. Строительство белорусской национальной школы в условиях политики белорусизации. 1921–1930 годы (общественно-политический аспект): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / Т. И. Баталко; Белорусский государственный ун-т. – Минск, 1993. – 23 с.; Дзянісаў, А. У. Краязнаўчы рух у БССР у 20–30-я гг. XX ст.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. У. Дзянісаў; Беларускі дзяржаўны педагагічны ўн-т імя Максіма Танка. – Мінск, 2008. – 23 с.; Жук, В. Н. Польское национальное меньшинство в БССР (1921–1939 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / В. Н. Жук; Нац. АН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2009. – 23 с.

[42] Бяспалая, М. А. Беларуская вёска ў 1921–1927 гг.: автореф. дис. ... докт. ист. наук: 07.00.02 / М. А. Бяспалая; Беларускі дзяржаўны педагагічны ун-т імя Максіма Танка. – Мінск, 1999. – 38 с.

шырокага профілю[43], так і канкрэтнай грамадска-палітычнай[44], і сацыяльна-эканамічнай[45] праблематыкі.

Асобныя аспекты ўказанай намі праблематыкі адлюстраваны ў матэрыялах іншых грамадскіх арганізацый, ваенных структур, абагульняючых зборніках і статыстычных даведніках[46].

Змястоўныя даныя адносна колькасці, узросту, месцы пражывання, пісьменнасці юнакоў і дзяўчат БССР утрымліваюць матэрыялы перапісаў 1926 г.[47] і 1939 г.[48]

Цікавымі, хоць і суб'ектыўнымі крыніцамі ў вывучэнні гісторыі беларускага маладзёжнага руху з'яўляюцца ўспаміны актывіста беларускіх студэнцкіх арганізацый у БССР М. Ганчарыка[49]. Гэта выданне выразна і жыва перадае каларыт часу. У зборніках дакументаў і матэрыялаў, выдадзеных у 70-я – 80-я гг. XX ст., змешчаны пэўныя крыніцы па праблеме удзела маладога пакалення 1921–1939 гг. у аднаўленні народнай гаспадаркі[50], ажыццяўленні індустрыялізацыі[51] і калектывізацыі[52],

---

[43] Комсомол Белоруссии 5 лет на аванпостах. Сборник материалов. – Минск: Белтрестпечать, 1924. – 136 с.; Комсомол Белоруссии в цифрах. – Минск: [б. и.], 1926. – 76 с.; 10 год Ленінскага комсамолу Беларусі, 1918–1928: матэрыялы для дакладаў аб гадавіне ЛКСМБ. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928. – 10 с.; Да IX з'езда ЛКСМБ. Зборнік матэрыялаў. – Менск: Чырвоная зьмена, 1928. – 70 с.; Рэзалюцыя III пленуму ЦК ЛКСМБ (люты 1929 г.). – Менск: выдавецтва "Чырвоная зьмена", 1929. – 64 с.; Комсамол і працоўная моладзь да X з'езда ЛКСМБ. У лічбах. – Менск: [б. в.], 1930. – 152 с.; Пастановы і рэзолюцыі другога Пленуму ЦК ЛКСМБ. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1931. – 31 с.; Пастановы і рэзолюцыі III пленуму ЦК ЛКСМБ. – Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1931. – 40 с.

[44] В помощь комсомольцу-политруку (сборник материалов политико-просветительной работы среди допризывников). – Минск: ЦК ЛКСМБ, Политсекретариат Белорусского военного комиссариата, 1924. – 162 с.; Комсомол и его актив. Статистический сборник о численном и качественном составе ВЛКСМ и актива за 1927 и 1928 гг. Вып. XIX. – Москва: 7-я типография "Искра революции" Мосполиграфа; Ленинград: Молодая гвардия, 1929. – 45 с.; Памятка камсамольцу да перавыбараў спажывецкай кааперацыі. – Мн.: "Чырвоная зьмена", 1929. – 16 с.

[45] Паход ЛКСМБ за ўраджай і калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Зборнік матэрыялаў / Склад.: С.Туркін [і інш.]. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1929. – 79 с.; Пачынаем соцыялістычнае спаборніцтва супраць прагулаў, браку, разгільдзяйства, марнатраўства, "вочкаўцірацельства", пустаслоўя, рабскіх адносін да варштату, за культуру працы, павышэнне тэхнічных ведаў, беражлівыя, гаспадарчыя адносіны да варштату, машын, рацыянальнае скарыстанне кожнай капейкі, кожнага кавалачка матэрыяла. – Менск: Выдавецтва ЦК ЛКСМБ, 1929. – 28 с.; Комсамол за сілос. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930. – 29 с.; Комсамол за аўладаньне агратэхнікай. Зборнік матэрыялаў. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1931. – 94 с.; Комсамол у ашчадсправе. Зборнік матэрыялаў па ўдзеле комсамольцаў у развіцці ашчадсправы. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1931. – 39 с.

[46] Белорусская ССР в цифрах. К 10-летию существования БССР (1919–1929 гг.). – Минск: [б. и.], 1929. – 534 с.; Культурное строительство БССР. Статистический справочник. – Минск: УНХУ БССР, 1940. – 111 с.; Пагранічнікі. Зборнік матэрыялаў. – Менск: Чырвоная зьмена, 1936. – 72 с.; Резолюции Всероссийск. Учредительн. Конференции. Программа и устав Е.С.С.Р.М. "Югенд Поалей-цион". – Москва: 20-я государственная типография, 1921. – 31 с.

[47] Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 г.: краткие сводки. В 10 вып. Вып. 5. Возраст и грамотность. Европейская часть РСФСР. Белорусская ССР. – Москва: ЦСУ Союза ССР, 1928. – XXV, 61 с.

[48] Всесоюзная перепись населения 1939 года. Основные итоги / под. ред. Ю. А. Полякова. – Москва: Наука, 1992. – 256 с.

[49] Ганчарык М. М. Шлях ад пачатку стагоддзя. Успаміны. – Мінск: ННАЦ імя Ф. Скарыны, 2003. – 290 с.

[50] Восстановление народного хозяйства БССР (1921–1925 гг.). Сборник документов и материалов / Сост. Л. Ф. Геращенко [и др.]; под ред. З. И. Гиоргидзе [и др.]. – Минск: Беларусь, 1981. – 270 с.; Восстановление народного хозяйства Гомельской губернии (1921–1925 гг.). Сборник документов и материалов / Сост. И. Б. Кудрявицкий [и др.]; под ред. М. Е. Шкляра (глав. ред.) [и др.]. – Гомель: Полеспечать, 1981. – 682 с.

[51] Индустриализация Белорусской ССР (1926–1941 гг.). Сборник документов и материалов / Сост.: Р. С. Васильева, Л. П. Нартыш-Блук, К. Ф. Плахотникова, Л. Н. Яшенко (отв. сост.). Под ред. В. Н. Жигалова и др. – Минск: Беларусь, 1975. – 468 с.

[52] Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1929 г. – 1932 г.). Сборник документов и материалов / Сост. В. В. Грамович, Л. Н. Яшенко (отв.); под ред. А. И. Азарова и др. – Минск: Беларусь, 1973. – 424 с.; Завершение коллективизации сельского хозяйства и организационно-хозяйственное укрепление колхозов Белорусской ССР (1933 – июнь 1941 г.). Сборник документов и материалов / Сост.

сацыялістычным спаборніцтве [53]. Аднак нельга не адзначыць недастатковую інфармацыйную насычанасць апублікаваных у савецкі перыяд зборнікаў дакументаў. У асноўным яны ўключалі рашэнні партыйных і дзяржаўных органаў, адлюстроўвалі станоўчыя вынікі сацыялістычных ператварэнняў.

Значна больш аб'ектыўным падыходам складальнікаў характарызуюцца зборнікі дакументаў і матэрыялаў, якія ўбачылі свет у пачатку XXI ст. і ўтрымліваюць пэўныя матэрыялы па даследуемай праблеме. Гэта зборнікі, прысвечаныя адлюстраванню тэндэнцый палітычнага і духоўнага жыцця Савецкай Беларусі ў 1925 – 1928 гг.[54], ажыццяўленню палітыкі беларусізацыі ў 1920-я гг.[55]

Асобна варта адзначыць выдадзены ў Расійскай Федэрацыі зборнік дакументаў аб жыцці дзяцей і моладзі Смаленшчыны ў 1920-я – 1930-я гг.[56]

У працы таксама выкарыстаны матэрыялы з архіваў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Асноўную крыніцавую базу даследавання склалі дакументы дзяржаўных, партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных органаў розных узроўняў. Важную іх частку прадстаўляюць рэзалюцыі і матэрыялы з'ездаў, пленумаў, канферэнцый, сходаў і нарад. Іх вывучэнне дазволіла выявіць сутнасць і накіраванасць рашэнняў, што прымаліся, у справе распрацоўкі і рэалізацыі маладзёжнай палітыкі, абумоўленасць вылучаных задач і іх практычныя вынікі. Многія з выяўленых архіўных дакументаў уведзены ў навуковы зварот упершыню.

Асноўнай крыніцай даследавання праблемы сталі матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Найбольшы пласт дакументаў па ўдзеле моладзі ў грамадска-палітычных, сацыяльна-эканамічных і духоўна-культурных працэсах знаходзіцца ў ф. 63п "Цэнтральны Камітэт Ленінскага Камуністычнага саюза моладзі Беларусі". У ф. 4п "Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі" маюцца дакументальныя крыніцы аб уплыве структур кампартыі на маладзёжны рух і актыўнасць юнакоў і дзяўчат у жыцці грамадства. Стратэгічныя кірункі развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі прадстаўлены ў дакументах ф. 6 "Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР" і ф. 7 "Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь". Дакументальныя крыніцы аб удзеле моладзі ў станаўленні і развіцці сістэмы адукацыі знаходзяцца ў ф. 42 "Міністэрства асветы БССР". Пэўныя пытанні працаўладкавання юнацтва, аховы працы падлеткаў адлюстраваны ў ф. 44 "Народны камісарыят працы БССР". Дакументы аб дзейнасці моладзі па развіцці сельскай гаспадаркі змяшчае ф. 48 "Мінсельгасхарч Рэспублікі Беларусь". Удзел маладога пакалення ў дзейнасці органаў дзяржаўнага кантролю прадстаўлены ў ф. 101 "Народны камісарыят рабоча-сялянскай інспекцыі БССР", у ліквідацыі непісьменнасці – у ф. 258 "Цэнтральны савет Усебеларускага таварыства "Далоў непісьменнасць", у атэістычнай прапагандзе – у ф. 261 "Цэнтральны савет Саюза ваяўнічых бязбожнікаў БССР". Дакументы па дзейнасці

---

В. В. Грамович, Л. П. Нартыш-Блук, К. Ф. Плахотникова, Н. Л. Рябцевич, Р. С. Степурко (отв.). Ред. М. П. Костюк, В. В. Лашкевич, М. Е. Стрельцов. – Минск: Беларусь, 1985. – 286 с.

[53] Развитие социалистического соревнования в Белорусской ССР (1919–1941 гг.). Документы и материалы / Р. С. Васильева, Т. А. Воробьева (отв.), М. Т. Минько, Л. Ф. Сакович; под ред. В. И. Вышинского и др. – Минск: Беларусь, 1980. – 272 с.

[54] Перед крутым поворотом. Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.). Отражение времени в архивных документах / Авт.-сост.: Р. П. Платонов и др. Под ред. Р. П. Платонова. – Минск: БелНИИДАД, 2001. – 312 с.

[55] Беларусізацыя. 1920-я гады. Дакументы і матэрыялы / Аўтары-складальнікі У. К. Коршук, Р. П. Платонаў, І. Ф. Раманоўскі, Я. С. Фалей; пад агуль. Рэд. Р. П. Платонава і У. К. Коршука. – Мінск: БДУ, 2001. – 270 с.

[56] Дети и молодежь Смоленщины: 1920–1930-е годы. Сборник документов / Авторы-составители Т. И. Новосельцева, Н. Ф. Пикалова, Е. А. Потапова. Под ред. Е. В. Кодина (отв. ред.), О. В. Виноградова, А. М. Дедкова, С. Л. Солодовникова. – Смоленск: Маджента, 2006. – 528 с.

моладзі ў прафсаюзах знаходзяцца ў ф. 265 "Савет Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі", ф. 268 "Арганізацыйнае бюро студэнцкіх секцый пры ЦСПСБ", а таксама ў фондах шэрага галіновых прафсаюзаў. У ф. 701 "Камісія па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі пры Цэнтральным Выканаўчым Камітэце БССР" маюцца дакументы аб правядзенні нацыянальнай палітыкі ў маладзёжным асяроддзі.

Дакументальныя сведчанні аб дзейнасці маладых пісьменнікаў прадстаўлены ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, у ф. 225 "Усебеларускае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў "Малад- няк" пры Інстытуце беларускай культуры".

Шэраг цікавых дакументаў, якія адлюстроўваюць праблему, што даследуецца, на мясцовым узроўні ўсходнебеларускіх тэрыторый, якія ўваходзілі ў склад РСФСР, ёсць у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці, у ф. 10112п "Віцебскі губернскі камітэт Расійскага камуністычнага саюза моладзі" і ў Дзяржаўным архіве грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці, у ф. 7 "Гомельскі губернскі камітэт Усесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза моладзі".

Дакументы аб працы моладзі ў навуковай сферы прадстаўлены ў Цэнтральным навуковым архіве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: ф. 1 "Прэзідыум", ф. 1а "Аддзел навуковых кадраў", ф. 67 "Інстытут беларускай культуры".

Значная колькасць дакументальных матэрыялаў па ўказанай праблеме ўтрымліваецца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (ф. А1565 "Галоўнае упраўленне прафесійнай адукацыі Наркамата асветы РСФСР"; ф. А2313 "Галоўны палітыка-асветны камітэт пры Наркамаце асветы РСФСР"; ф. Р5207 "Камісія па паляпшэнні жыцця дзяцей пры Усерасійскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэце СССР"; ф. Р5451 "Усесаюзны цэнтральны савет прафесійных саюзаў"; ф. Р5462 "Цэнтральныя камітэты прафесіянальных саюзаў работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў"; ф. Р5515 "Народны камісарыят працы СССР"; ф. Р5574 "Арганізацыйнае бюро студэнцкіх секцый ВЦСПС"; ф. Р6990 "Паўнамоцная камісія Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта па барацьбе з бандытызмам на Заходнім фронце", ф. Р7541 "Камітэт па зямельнаму ўладкаванню працоўных яўрэяў пры прэзідыуме Савета нацыянальнасцяў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР", ф. Р7576 "Камітэт фізічнай культуры і спорта СССР") і Расійскім дзяржаўным архіве сацыяльна-палітычнай гісторыі (ф. М1 "Цэнтральны камітэт ВЛКСМ"; ф. М32 "Цэнтральны камітэт Яўрэйскага камуністычнага саюза моладзі").

Рознабаковасць кірункаў працы маладзёжных арганізацый вызначыла відавую разнастайнасць дакументаў. Гэта пратаколы, пастановы, інфармацыйныя і цыркулярныя лісты, інструкцыі, справаздачы, даведкі, рапарты, тэксты сацыялістычных абавязацельстваў, планы працы, асабістая перапіска.

З комплексу крыніц па тэме аснову даследавання склалі нарматыўна-прававыя акты, статыстычныя матэрыялы, справаводчая дакументацыя (распарадчыя, арганізацыйныя, пратакольныя, справаздачныя, уліковыя, кантрольныя, фінансавыя, даведачна-інфармацыйныя дакументы, службовая перапіска), матэрыялы перыядычнага друку.

Архіўныя крыніцы пераканаўча сведчаць: народжаны рэвалюцыяй, верай у хуткае ажыццяўленне яе ідэалаў, народны энтузіязм прыносіў вялікі плён у развіцці эканомікі і культуры, будаўніцтве дзяржавы. Але тыя ж крыніцы даносяць да нас не меншую колькасць фактаў аб цяжкіх выпрабаваннях, што выпалі на долю моладзі Савецкай Беларусі ва ўмовах левардыкальнага палітычнага курсу, жорсткай класавай барацьбы, рэпрэсій, мабілізацыйнай эканомікі, звышінтэнсіўнага будаўніцтва.

Цікавую для навуковага аналізу крыніцавую базу ўяўляюць матэрыялы тагачаснага дзяржаўнага і грамадскага перыядычнага друку, у першую чаргу

маладзёжных газет і часопісаў. Яны даюць яскравае адлюстраванне гістарычных фактаў і падзей, дазваляюць зрабіць высновы пра аб'ектыўнасць прадастаўлення інфармацыі для масавага чытача.

Канешне, у большасці публікацыі ў перыядычным друку мелі суб'ектыўны характар, але яны паказвалі практычную дзейнасць моладзі, камсамола, студэнцкіх аб'яднанняў на грунце канкрэтных прыкладаў. На працягу ўсяго азначанага перыяду газеты і часопісы былі адным з індыкатараў актыўнасці юнацтва, адлюстраваннем яго каштоўнасных арыентацый, важным інструментам выхавання і асветы маладога пакалення.

Аналіз апублікаваных і архіўных крыніц сведчыць, што шматлікія пытанні дзейнасці моладзі Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. застаюцца недастаткова вывучанымі. Метадалагічныя падыходы і палітычная кан'юнктура, што існавалі, доўгі час не дазвалялі айчынным даследчыкам паглыбіцца ў асэнсаванне вытокаў маладзёжных арганізацый Беларусі, вызначыць іх палітычную сутнасць, нацыянальна-дзяржаўную арыентаванасць, асноўныя кірункі дзейнасці. Увогуле многія дакументы і матэрыялы па ўказанай праблематыцы патрабуюць новага, аб'ектыўнага прачытання і асэнсавання. Пры гэтым у ацэнцы мінулага патрэбна зыходзіць з таго, што гісторыя нашай Бацькаўшчыны не мае тупікоў, што яе развіццё з глыбінь вякоў і да нашых дзён з'яўляецца адзінай нацыянальнай каштоўнасцю. Аднак гэта зусім не значыць, што мы павінны, як і раней, імкнуцца да лакіроўкі, замоўчвання і тым больш дапускаць скажэнні гістарычнай праўды.

**"Моладзь у працэсах грамадска-палітычнага жыцця"**. У Савецкай Беларусі пад уплывам кампартыі ажыццяўлялася мэтанакіраваная разбудова структур камсамола як цэнтра гуртавання моладзі краіны. Разам з тым сацыяльна-палітычныя пераўтварэнні стварылі ўмовы для разгортвання нацыянальнага маладзёжнага руху, які пакінуў адметны след у грамадска-палітычным жыцці. У цэлым у грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат назіралася тэндэнцыя нестабільнасці. Тым не менш большасць камсамольцаў і несаюзнай моладзі падтрымлівалі дзяржаўную палітыку. У выніку правядзення савецкімі ўладамі і кампартыяй палітыкі па выцясненні з грамадска-палітычнага поля альтэрнатыўных маладзёжных арганізацый камсамол з'яўляўся адзінай афіцыйнай арганізацыяй моладзі.

Дзейнасць шматлікіх некамуністычных структур і плыняў адцягвала значную колькасць моладзі, ускладняла пашырэнне радоў камсамола і распаўсюджванне камуністычных ідэй у маладзёжным асяроддзі. Арганізацыйнае афармленне беларускага камсамола абцяжарвалася і наяўнасцю апазіцыі ў кампартыі. Да таго ж адсутнасць вопыту арганізацыйнага будаўніцтва, недастатковая грамадска-палітычная дасведчанасць некаторых кіраўнікоў і многіх камсамольцаў непазбежна прыводзілі да ўзнікнення непаразумення і процістаяння. Кіраўніцтва краіны і маладзёжнага саюза надавала вялікую ўвагу арганізацыйнаму ўмацаванню КСМБ. Гэтыя пытанні пастаянна разглядаліся на пасяджэннях партыйных і камсамольскіх органаў, іх вырашэнне адбывалася таксама з дапамогай частага склікання з'ездаў саюза.

У працэсе станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. можна выдзяліць чатыры перыяды. Першы перыяд ахоплівае 1921–1923 гг. Гэта быў час арганізацыйнага станаўлення КСМБ. Агульнымі намаганнямі партыйных і камсамольскіх органаў назапашваўся неабходны вопыт, умацоўвалася структура саюза. Напрыканцы 1923 г. ён налічваў 6 паветгаркамаў, 2 ГК з 4 РК, 315 ячэек, звыш 5 тыс. членаў і кандыдатаў. Другі перыяд ахоплівае 1924–1927 гг., калі адбывалася арганізацыйная разбудова саюза. Неабходнасць унясення значных змяненняў у

структуру КСМБ выклікала ўзбуйненне БССР. Намаганнямі камсамольскіх лідараў і пры падтрымцы партыйных камітэтаў да канца 1927 г. удалося заснаваць 12 акруговых і 111 раённых камітэтаў, 2300 ячэек, якія аб'ядноўвалі больш за 62 тыс. членаў і кандыдатаў. Трэці перыяд ахоплівае 1928–1933 гг. У гэты час ЛКСМБ перажываў сістэмны арганізацыйны крызіс. Але гэта не перашкодзіла колькаснаму росту саюза. У 1933 г. 111 РК камсамола рэспублікі налічвалі каля 5300 ячэек, якія аб'ядноўвалі каля 109 тыс. членаў і кандыдатаў. Чацвёрты перыяд ахоплівае 1934–1939 гг., калі адбываўся паступовы выхад з крызісу і пераадоленне арганізацыйных складанасцей. У пачатку 1939 г. ЛКСМБ налічваў 5 абкамаў, 92 РК, 5 ГК і каля 11100 пярвічных арганізацый, якія аб'ядноўвалі амаль 225 тыс. членаў і кандыдатаў. Была выпрацавана добракіраваная сістэма камсамольскіх органаў.

У першай палове 1920-х гг. у Савецкай Беларусі дзейнічалі невялікія беларускія маладзёжныя гурткі. Але ім так і не ўдалося стварыць уласны каардынацыйны цэнтр, што сведчыць аб слабасці беларускага нацыянальнага руху ў асяроддзі юнакоў і дзяўчат. Са свайго боку ўлады падвяргалі праследаванням беларускія нацыянал-дэмакратычныя маладзёжныя арганізацыі. У выніку легальныя маладзёжныя беларускія аб'яднанні некамуністычнай накіраванасці як на тэрыторыі БССР, так і ў іншых савецкіх рэспубліках спынілі сваю дзейнасць яшчэ ў першай палове 1920-х гг. Праявы ж нелегальнай дзейнасці падобных груповак былі нешматлікімі, бо ўладам разам з камсамолам удалося забяспечыць патрэбы нацыянальна-культурнага развіцця пераважнай большасці беларускай моладзі.

Развіццё арганізацый яўрэйскай моладзі адбывалася па двух напрамках: камуністычным і сіяністкім. У пачатку 1920-х гг. яўрэі актыўна спрабавалі захаваць на камуністычным палітычным полі асобны маладзёжны яўрэйскі сектар у выглядзе ЯКСМ, які да 1923 г. з'яўляўся рэальным канкурэнтам камсамола ў асяроддзі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат. Аднак з-за супрацьдзеяння ўлад наладзіць працу ЯКСМ не ўдалося. Сярод сіяністкіх маладзёжных арганізацый Савецкай Беларусі выразна вылучаліся тры групы: правыя, адукацыйна-культурныя і левыя. Да правых адносіліся Арганізацыя сіяністкай моладзі і іншыя больш дробныя групоўкі; да адукацыйна-культурных – Гашомер-Гацаір, Гехавер, Гехалуц, Макабі; да левых – ЯССРМ "ЮПЦ", СССМ і Цэірэй Цыён. Пры гэтым калі ў першай палове 1920-х гг. найбольш буйной арганізацыяй з'яўляўся Гехалуц, то ў другой палове – СССМ. Улады не спрыялі дзейнасці маладзёжных сіяністкіх арганізацый, але дзякуючы добра распрацаванай сістэме працы сярод розных пластоў яўрэйскай моладзі іх колькасны склад пашыраўся і дасягнуў найбольшых паказчыкаў у 1925 г. Аднак у выніку адсутнасці адзінства ў сіяністкім руху, узмацнення працідзеяння ўлад, паляпшэння экнамічнага становішча яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат з канца 1926 г. уплыў маладзёжных сіяністкіх арганізацый слабеў і пачаўся распад іх мясцовых структур. Апошняя спроба актывізацыі працы сіяністаў сярод яўрэйскай моладзі была прадпрынята лідарамі руху ў 1928–1931 гг.

У арганізацыі палітасветы моладзі Савецкай Беларусі можна вылучыць чатыры перыяды. Першы ахоплівае 1921–1923 гг., калі адбывалася станаўленне сістэмы маладзёжнай палітасветы. У выніку ў канцы 1923 г. у Савецкай Беларусі дзейнічалі больш за 200 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол. Усяго палітвучобай было ахоплена каля 16 тыс. юнакоў і дзяўчат. Другі прыпадае на 1924–1928 гг., калі, нягледзячы на разнастайныя складанасці, адбывалася паступальнае развіццё сістэмы палітасветы. У 1928 г. у БССР працавалі каля 1500 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол, дзе навучаліся больш за 37 тыс. маладых людзей. Трэці перыяд прыходзіцца на 1929–1935 гг., калі з-за радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў адбыўся фактычны заняпад палітасветы. Адсутнічаў дакладны ўлік

палітгурткоў і палітшкол. Палітвучоба адбывалася пераважна ў гуртках бягучай палітыкі, вытворчых палітшколах, школах навічкоў і тэматычных палітгуртках. Да 1935 г. палітасветай было ахоплена толькі каля 30 тыс. маладых людзей. Чацвёрты перыяд ахоплівае 1936–1939 гг. і характарызуецца арганізацыйным аднаўленнем і пашырэннем сістэмы палітасветы, паляпшэннем яе якасці. Так, у 1939 г. працавалі каля 8200 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол, у якіх навучаліся каля 225 тыс. камсамольцаў і каля 40 тыс. несаюзных юнакоў і дзяўчат.

Кіраўніцтва кампартыі арганізоўвала палітасвету юнакоў і дзяўчат, абапіраючыся на камсамольскія структуры. У працэсе няпростага шляху станаўлення і развіцця сістэмы палітвучобы маладога пакалення мэтанакіраваная дзейнасць партыйных і камсамольскіх органаў давала станоўчыя вынікі. Усяго за азначаны перыяд, па нашых падліках, структурамі камсамола былі праведзены 28 значных акцый і кампаній, накіраваных на пашырэнне палітасветы маладога пакалення.

У Савецкай Беларусі была створана сістэма прыцягнення здольнай моладзі да працы ў структурах дзяржаўнага апарату. Разам з тым узаемадзеянне дзяржаўных органаў з моладдзю і з камсамолам, а таксама сістэмная арганізацыя працы камсамольцаў у органах улады і кіравання былі належным чынам арганізаваны толькі ў 1930-я гг. Тым не менш, нягледзячы на недапрацоўкі і складанасці, асабліва ў развіцці судовай сістэмы, пашыраўся ўдзел маладых людзей у працы структур дзяржаўнага апарату. Калі ў пачатку 1920-х гг. гэта былі адзінкі, то напрыканцы ўказанага перыяду – дзясяткі тысяч. Пры гэтым кіраўніцтва кампартыі адводзіла камсамолу важную ролю ў сістэме кіравання краінай. Яму аказвалася вялікая падтрымка на дзяржаўным узроўні. Прадметам асаблівай увагі кіраўніцтва кампартыі і дзяржавы, а таксама камсамола было пашырэнне ў структурах дзяржаўнага апарату праслойкі камсамольцаў і моладзі, што павінна было забяспечваць устойлівасць улады і эвалюцыйную яе пераемнасць.

Аднак на працягу 1920-х гг. у камсамоле Савецкай Беларусі адсутнічала добра адпрацаваная і зладжаная сістэма ўдзелу ў перавыбарах саветаў і арганізацыі працы камсамольцаў-дэпутатаў. Рост колькасці членаў камсамола ў саветах быў нестабільны, бо часта камсамольскія ячэйкі выступалі неарганізавана, самі камсамольцы не мелі яшчэ трывалага аўтарытэту сярод насельніцтва. Тым не менш палітыка вылучэння камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў саветы не спынялася і ў 1930-я гг. Камсамольскія арганізацыі дэманстравалі высокую актыўнасць у час выбараў. У саветах расла колькасць камсамольцаў, але іх удзельная вага сярод маладых дэпутатаў скарачалася. Такое становішча сведчыць як аб значнай грамадскай актыўнасці юнакоў і дзяўчат у той час, так і аб наяўнасці сістэмнай дзяржаўнай палітыкі па актыўным прыцягненні здольнай моладзі да працы ў саветах незалежна ад яе прыналежнасці да камсамола.

Адным з важных кірункаў дзейнасці камсамола з'яўляўся ўдзел у рабоце прафсаюзных арганізацый. Камсамольскае кіраўніцтва разглядала іх як пляцоўку для актывізацыі ўплыву на моладзь.

У прафсаюзным руху надавалася асаблівая ўвага працы са студэнцтвам, што яскрава праявілася ў стварэнні для гэтай мэты асобных прафсаюзных структур, якія актыўна выкарыстоўваліся для ажыццяўлення палітыкі кіраўніцтва кампартыі ў грамадскім асяроддзі. Ліквідацыя ж напрыканцы 1930-х гг. асобнага кіруючага органа для студэнтаў – членаў прафсаюзаў, на наш погляд, хутчэй за ўсё з'яўляецца вынікам палітычнай барацьбы ўнутры кампартыі і сведчыць аб тым, што ён не апраўдаў спадзяванняў партыйнага кіраўніцтва.

Дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх арганізацый, колькасць моладзі ў прафсаюзах вырасла з некалькіх тысяч у пачатку

1920-х гг. да больш 100 тыс. у канцы 1930-х гг. Але дасягнуць канчатковага станоўчага пералому ў іх працы з юнакамі і дзяўчатамі ў разглядаемы перыяд так і не ўдалося.

Партыйныя, дзяржаўныя і камсамольскія органы надавалі значную ўвагу развіццю кааператыўнага руху ў маладзёжным асяроддзі. Заахвочвалася ўключэнне ў кааператыўнае кіраўніцтва як камсамольцаў, так і несаюзнай моладзі. На пачатку моладзь была слаба звязана з кааператыўным рухам. Але са стварэннем спрыяльных умоў для развіцця кааперацыі і ўцягнення ў яе юнакоў і дзяўчат з дапамогай шэрага льгот актыўнасць моладзі з 1925 г. пачала расці. Найбольш павялічвалася прадстаўніцтва маладога пакалення ў спажывецкім і крэдытным кааперыраванні, значна слабей – у сельскагаспадарчым і прамысловым.

З другой паловы 1920-х гг. камітэты і ячэйкі камсамола праводзілі планавую працу па масавым пашырэнні кааперацыі сярод насельніцтва. Пры гэтым структурам саюза даводзілася весці барацьбу з заможнымі сялянамі за кантроль над кааперацыяй на вёсцы. У 1930-я гг. удзел моладзі ў кааператыўным руху развіваўся ў асноўным пад патранажам ЛКСМБ.

Камсамол імкнуўся аказваць актыўны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё маладога пакалення праз арганізацыю разнастайных мерапрыемстваў і пашырэнне свайго прадстаўніцтва ў грамадскіх арганізацыях. Па нашых падліках, за вызначаны перыяд структурамі камсамола былі праведзены 65 значных грамадска-палітычных кампаній, а таксама 48 буйных акцый па падрыхтоўцы дапрызыўнікаў да вайсковай службы, 53 – ваенна-патрыятычнага напрамку і 39 – ваенна-шэфскага, 19 – па накіраванні здольнай моладзі ў ваенна-навучальныя ўстановы. Але ў саюзе фактычна да другой паловы 1930-х гг. адсутнічала сістэма працы камсамольцаў у грамадскіх структурах, назіраўся ў значнай ступені фармальны падыход да гэтай справы. Таму павелічэнне колькасных паказчыкаў не заўсёды суправаджалася высокай якасцю працы.

Тым не менш паляпшэнне матэрыяльнага становішча, шырокая дзейнасць усіх грамадскіх арганізацый у сувязі з курсам кіраўніцтва кампартыі і камсамола на максімальнае ажыўленне іх працы павялічыла грамадскую актыўнасць моладзі. Узрос яе інтарэс да розных грамадскіх аб'яднанняў, павялічылася імкненне да ўступлення ў камсамол, што мела вялікае значэнне для сацыялізацыі юнакоў і дзяўчат.

Камітэты і ячэйкі камсамола Савецкай Беларусі актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе з апазіцыйнымі плынямі ў кампартыі. Тым не менш як у шэрагах несаюзнай моладзі, так і ў камсамольскіх арганізацыях назіралася тэндэнцыя распаўсюджвання антыпартыйных настрояў і выступленняў. У канцы 1920-х – першай палове 1930-х гг. у сувязі з ажыццяўленнем у краіне радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў праявы правай апазіцыі пашырыліся не толькі сярод асобных камсамольцаў, але і ахапілі цэлыя ячэйкі і нават РК ЛКСМБ. Адначасова апазіцыйную дзейнасць працягвалі і трацкісты. Сярод цэлай праслойкі камсамольцаў БССР, у тым ліку кіраўніцтва і актыву камсамольскіх арганізацый, назіраліся апазіцыйныя настроі, правыя і левыя скажэнні лініі кампартыі. Толькі напрыканцы 1930-х гг. у выніку выкарыстання рэпрэсіўных метадаў супраць апазіцыянераў сітуацыя ў ЛКСМБ змянілася на карысць прыхільнікаў І. Сталіна.

**"Удзел моладзі ў культурным будаўніцтве"**. Дзякуючы мэтанакіраванай рабоце партыйных і дзяржаўных органаў, актыўнаму ўдзелу маладога пакалення, асабліва арганізацыйнай дзейнасці камсамола, у Савецкай Беларусі была не толькі разгорнута вялікая праца па ліквідацыі непісьменнасці і стварэнні сістэмы школьнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, але і выхавана маладая генерацыя творчай нацыянальнай інтэлігенцыі. У 1920–1930-я гг., нягледзячы на цяжкасці і

складанасці, абсалютная большасць падрастаючага пакалення краіны ўпершыню ў беларускай гісторыі змагла атрымаць адукацыю, авалодаць багаццем нацыянальнай культуры, літаратуры і мастацтва. Былі створаны грамадскія творчыя маладзёжныя гурткі і аб'яднанні, якія сталі асяродкамі выхавання маладых творчых дзеячаў культуры. Тысячы выхадцаў з рабочых і сялян сталі выдатнымі пісьменнікамі, акцёрамі, мастакамі і музыкантамі. Важную ролю ў гэтым працэсе адыгралі і камсамольскія структуры. Разам з тым у выніку рэпрэсій пацярпела значная частка прадстаўнікоў маладой творчай генерацыі нацыянальнай інтэлігенцыі.

Дзякуючы вялікім намаганням партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных і камсамольскіх органаў, у Савецкай Беларусі была разгорнута мэтанакіраваная праца па ліквідацыі непісьменнасці і стварэнні сістэмы школьнай адукацыі. У выніку не толькі паспяхова адбывалася ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці, але і была пабудавана і наладжана сістэма школьнай адукацыі і падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Ключавую ролю ў гэтай важнай дзяржаўнай справе адыгрывала моладзь, асабліва камсамол. Па нашых падліках, камсамольскія структуры Савецкай Беларусі на працягу перыяду, што разглядаецца, правялі 115 адпаведных значных акцый: 28 – па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці і 77 – па развіцці і ўмацаванні школьнай адукацыі.

Мэтанакіраваная праца партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх органаў, нягледзячы на шматлікія цяжкасці і складанасці, прывяла да значнага пашырэння падрыхтоўкі кадраў кваліфікаваных працоўных з ліку моладзі. Так, калі ў пачатку 1920-х гг. ва ўстановах пачатковай прафесійнай адукацыі навучаліся тысячы юнакоў і дзяўчат, то напрыканцы вызначанага перыяда – дзясяткі тысяч.

Ва ўмовах адсутнасці шырокай сеткі агульнаадукацыйных школ важную ролю ў камплектаванні ССНУ і ВНУ выхадцамі з рабочых і сялян адыгрывалі рабфакі, якія ствараліся і працавалі пры актыўным удзеле камітэтаў камсамола.

Колькасць рабфакаўцаў паступова расла, хоць і не заўсёды стабільна. У выніку яна вырасла з менш 100 у 1920/21 н. г. да амаль 12 тыс. у 1934/35 н. г. Аднак рабфакі так і не сталі галоўнай крыніцай папаўнення ССНУ і ВНУ. З пашырэннем сеткі дзесяцігадовых агульнаадукацыйных школ роля рабфакаў пачала змяншацца. У выніку колькасць іх навучэнцаў скарацілася да некалькіх соцень напрыканцы вызначанага перыяду.

Партыйныя, дзяржаўныя, камсамольскія і прафсаюзныя органы шмат увагі надавалі працы са студэнцкай моладдзю, рэгуляванню яе сацыяльнага і нацыянальнага складу. Падборам і дэлегаваннем моладзі на рабфакі, у ССНУ і ВНУ займаліся структуры кампартыі, камсамола і прафсаюзаў. Ажыццяўляўся класавы падыход, які прадугледжваў першачарговы прыём у навучальныя ўстановы асоб рабоча-сялянскага паходжання.

Дзякуючы мэтанакіраваным захадам улад, актыўнай дзейнасці камсамольскіх арганізацый, колькасць студэнцтва ў Савецкай Беларусі за перыяд, што разглядаецца намі, павялічылася з каля 8 тыс. чалавек да больш 50 тыс., палепшылася і якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Сур'ёзная ўвага звярталася на патрыятычнае выхаванне і ідэйна-палітычную асвету студэнтаў. Гэтыя пытанні знаходзіліся пад асаблівай увагай структур камсамола. Такі падыход спрыяў фарміраванню творча актыўнай, адданай свайму народу маладой інтэлігенцыі.

У цэлым, па нашых падліках, камсамольскія структуры Савецкай Беларусі на працягу вызначанага перыяду правялі 77 значных акцый, накіраваных на развіццё і ўмацаванне сістэмы сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, пашырэнне ў маладзёжным асяроддзі навуковых ведаў.

Прыярытэт у дзяржаўнай нацыянальнай палітыцы сярод моладзі мела выхаванне яе ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізма і брацкай садружнасці народаў.

З мэтай задавальнення адукацыйных патрэб беларускіх, яўрэйскіх, польскіх юнакоў і дзяўчат у Савецкай Беларусі дзейнічалі адпаведныя нацыянальныя ўстановы адукацыі розных узроўняў.

Аднак да верасня 1924 г. інтэрнацыянальнае выхаванне маладога пакалення і нацыянальная праца сярод яго ў Савецкай Беларусі вяліся яшчэ эпізадычна. Толькі ў 1925 г. нацыянальна-культурная дзейнасць структур ЛКСМБ узмацнілася і была арганізацыйна афармлена.

Беларусізацыя ў розных сферах жыцця грамадства знаходзіла падтрымку дзякуючы намаганням у першую чаргу маладых беларусаў. З 1923 г. і кіраўніцтва КСМБ шмат увагі звяртала на ажыццяўленне беларусізацыі. Свайго піку беларусізацыя ў ЛКСМБ дасягнула ў 1928 г., а з 1929 г. пачала слабець, што можна патлумачыць унутраным крызісам у саюзе з-за абвастрэння грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча ў сувязі з правядзеннем масавай калектывізацыі і разгортваннем барацьбы з нацыянал-дэмакратамі. З 1934 г. беларусізацыя ў камсамоле не ажыццяўлялася як палітычная кампанія.

З сярэдзіны 1930-х гг. дзяржаўныя і грамадскія структуры БССР адышлі ад палітызацыі моўнага пытання. Тым не менш, нягледзячы на згортванне палітыкі беларусізацыі, беларуская мова захоўвала дастаткова трывалыя пазіцыі ў жыцці рэспублікі, у тым ліку і ў маладзёжным асяроддзі.

Адной з важных праблем, якая не садзейнічала поспеху рэалізацыі ідэі беларусізацыі, з'яўлялася шматнацыянальнасць жыхароў рэспублікі. Кампартыя і камсамол, якія дзейнічалі на прынцыпах інтэрнацыяналізму і дэмакратычнага цэнтралізму, вымушаны былі ўлічваць у сваёй дзейнасці дэмаграфічную сітуацыю. Кіруючым партыйным і камсамольскім структурам даводзілася вырашаць складаныя задачы арганізацыі працы з нацыянальнымі меншасцямі, каб пэўным чынам аказваць на іх уплыў. У прыватнасці, сярод моладзі нацыянальных меншасцей прыярытэт аддаваўся працы з яўрэямі, палякамі і латышамі.

У цэлым, па нашых падліках, камсамольскія структуры Савецкай Беларусі ў разгледжаны перыяд правялі 105 значных акцый, накіраваных на развіццё нацыянальна-культурнага жыцця і ўкараненне інтэрнацыяналізму ў маладзёжным асяроддзі.

Увогуле ва ўдзеле моладзі Савецкай Беларусі ў нацыянальна-культурным жыцці ў міжваенны перыяд можна вылучыць наступныя этапы:

1) 1921–1924 гг. – актыўная нацыянальна-культурная праца невялікіх груп моладзі;
2) 1925–1928 гг. – актывізацыя ўдзелу юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным будаўніцтве і выразнае арганізацыйнае афармленне нацыянальна-культурнай працы ЛКСМБ у маладзёжным асяроддзі;
3) 1929–1934 гг. – спад тэмпаў нацыянальна-культурнай працы сярод моладзі з-за грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных праблем;
4) 1935–1939 гг. – развіццё нацыянальна-культурнай працы сярод юнакоў і дзяўчат у напрамку ўмацавання інтэрнацыяналізму.

У раздзеле 3.3. *"Антырэлігійная плынь сярод моладзі"* сцвярджаецца, што толькі з 1923 г. камсамольцы пачалі праводзіць сістэматычную антырэлігійную агітацыю сярод насельніцтва, у тым ліку праз друк. На пачатковым этапе антырэлігійная дзейнасць мела пераважна дэманстрацыйна-карнавальны характар. Адпаведнае выхаванне маладога пакалення вялося эпізадычна. Такое становішча мала

перашкаджала духавенству розных канфесій весці плённую рэлігійную працу ў маладзёжным асяроддзі. Нават камсамольцы ўдзельнічалі ў рэлігійных абрадах.

Актывізацыя з 1925 г. наступлення камсамола на рэлігію выклікала ідэалагічнае супрацьдзеянне з боку духавенства і ўзмацненне рэлігійных і антыкамсамольскіх настрояў сярод шэрага груп моладзі. У выніку ўлады зрабілі стаўку на развіццё антырэлігійнай прапаганды праз Саюз бязбожнікаў, перш за ўсё ў асяроддзі юнакоў і дзяўчат. У адказ рэлігійныя арганізацыі імкнуліся весці барацьбу за маладое пакаленне з дапамогай розных форм сацыяльнай і культурна-масавай работы. Пік іх даволі паспяховай дзейнасці па пашырэнні ўплыву на моладзь прыпаў на 1928–1929 гг. Праявы рэлігійнасці адзначаліся не толькі ў асяроддзі шараговых камсамольцаў, але і нават сярод камсамольскіх актывістаў. Увогуле ў ЛКСМБ назіраліся супрацьлеглыя ваганні ў ажыццяўленні палітыкі ў адносінах да рэлігійных канфесій. Толькі з 1930 г. камсамольская антырэлігійная праца пачала ўзмацняцца. Пры падтрымцы камсамола колькасна вырас і пашырыў практычную дзейнасць СВБ. Аднак у другой палове 1930-х гг. у сувязі з арганізацыйным крызісам ЛКСМБ яго антырэлігійная праца зноў аслабела.

Тым не менш, па нашых падліках, камсамольскія структуры за ўвесь разгледжаны перыяд правялі 35 значных акцый і кампаній, накіраваных на пашырэнне антырэлігійнай плыні ў маладзёжным асяроддзі.

У выніку мэтанакіраванай антырэлігійнай дзейнасці партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх структур у 1930-я гг. атэістычны светапогляд ахапіў пераважную большасць юнакоў і дзяўчат, як мінімум у форме дэкларатыўнага праяўлення. Разам з тым і напрыканцы вызначанага перыяду рэлігійныя ўплывы захоўваліся сярод асобных груп моладзі і нават некаторых камсамольцаў.

Улады праводзілі актыўную палітыку па ўключэнні моладзі ў ажыццяўленне культурных пераўтварэнняў, якім надавалася важнае палітычнае значэнне. Прычым кіраўніцтва кампартыі і дзяржавы абапіралася ў гэтай справе перш за ўсё на камсамол. Увогуле ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі ў асноўным трымалася на энтузіязме маладых людзей, якія ў большасці станоўча яе ўспрымалі і актыўна прапагандавалі.

Разам з тым акрамя камсамольскіх да сярэдзіны 1920-х гг. дзейнічалі і іншыя маладзёжныя культурныя асяродкі, якія ствараліся па ўласнай ініцыятыве юнакоў і дзяўчат, у тым ліку і выхадцамі з Беларусі ў іншых савецкіх рэспубліках. Многія такія аб’яднанні былі накіраваны на развіццё і папулярызацыю беларускай культуры.

Аднак у 1920-я гг. развіццё культуры ў маладзёжным асяроддзі стрымлівалася недахопам матэрыяльных сродкаў. Сетка камсамольскіх клубаў была невялікай і не магла задаволіць патрэбы моладзі. Таму камсамол актыўна ўзаемадзейнічаў у сферы культурнай працы з прафсаюзамі. Найбольш эфектыўнай формай культурнай работы сярод маладога пакалення былі гурткі мастацкай самадзейнасці. Але ў барацьбе за новы быт камсамольскія ячэйкі часта дапускалі перагібы. Тым не менш, дзякуючы мэтанакіраванай падтрымцы з боку партыйных і дзяржаўных органаў, паступова расла сетка камсамольскіх клубаў. Узмацнялася прыцягненне да клубнай працы моладзі.

У 1930-я гг. камітэты і ячэйкі камсамола значна пашырылі свой уплыў у сферы культуры, узрасла зацікаўленасць моладзі мастацкай самадзейнасцю, якая развілася асабліва шырока. У культурна-асветнай дзейнасці сярод насельніцтва актыўны ўдзел прымалі навучэнцы і студэнты. Паляпшэнне эканамічнага становішча і шырокая культурная праца грамадскіх арганізацый спрыялі росту культурнага ўзроўню юнакоў і дзяўчат.

Партыйныя, дзяржаўныя і камсамольскія органы надавалі вялікую ўвагу арганізацыі ўдзелу моладзі ў развіцці беларускай літаратуры ў вызначаным

ідэалагічным рэчышчы, павелічэнню маладзёжных творчых літаратурных сіл. Актыўны ўдзел у выхаванні новай асобы прымалі маладыя пісьменнікі, на творчае станаўленне якіх уплываў камсамол, у першую чаргу праз літаратурнае таварыства "Маладняк". Нягледзячы на ўсе недахопы, "Маладняк" адыграў вялікую ролю ў збіранні маладзёжных літаратурных сіл і іх прафесійным росце. Але ён аказаўся няздольны задаволіць патрэбы ўсіх маладых літаратараў, што прывяло да стварэння новых літаратурных аб'яднанняў.

Партыйныя, дзяржаўныя і камсамольскія органы таксама надавалі вялікую ўвагу арганізацыі ўдзелу моладзі ў развіцці нацыянальнага тэатральнага мастацтва і беларускай кінематаграфіі ў адпаведнасці з вызначанай кампартыяй ідэалогіяй. Структуры камсамола вялі шырокую працу па папулярызацыі ў маладзёжным асяроддзі тэатральнага мастацтва і кінаматаграфіі. У выніку моладзь не толькі актыўна ўдзельнічала ў драматычных гуртках, самадзейных тэатральных калектывах "Сіняя блуза", ТРАМах, але і папаўняла шэрагі прафесійных тэатральных дзеячаў і кінематаграфістаў.

Камсамольцы і несаюзная моладзь, нягледзячы на цяжкасці і складанасці, актыўна і плённа ўдзельнічалі ў развіцці нацыянальнага выяўленчага і музычнага мастацтваў. Менавіта ў 1920–1930-я гг. пачалі свой творчы шлях цэлы шэраг выдатных беларускіх мастакоў, скульптараў, спевакоў і кампазітараў.

Усяго, па нашых падліках, камсамольскія структуры правялі 62 значныя акцыі і кампаніі, накіраваныя на пашырэнне грамадска-культурнай працы ў маладзёжным асяроддзі, а таксама 165 буйных фізкультурных і спартыўных мерапрыемстваў.

**"Дзейнасць моладзі у сацыяльна-эканамічнай сферы"**. Дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці партыйных і дзяржаўных органаў, актыўнай арганізацыйнай рабоце камсамола, у Савецкай Беларусі была разгорнута вялікая праца па забеспячэнні сацыяльна-эканамічных правоў юнакоў і дзяўчат, уключэнню іх у мадэрнізацыю эканомікі, паспяховае ажыццяўленне палітыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі. Больш таго, была падрыхтавана маладая генерацыя кваліфікаваных працоўных у розных сферах народнай гаспадаркі, што з'ўлялася неабходнай умовай паспяховага эканамічнага развіцця краіны.

Нягледзячы на разнастайныя складанасці і недахопы, даволі актыўную дзейнасць па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў маладога пакалення і арганізацыі ўдзелу моладзі ў развіцці эканомікі вялі структуры камсамола, які карыстаўся моцнай падтрымкай кампартыі і дзяржавы. Аднак працяглы час шырока і трывала забяспечыць правы маладога пакалення ў сацыяльна-эканамічнай сферы камсамолу не ўдавалася.

Разам з тым пачатае па ініцыятыве камсамола сацыялістычнае спаборніцтва ў асяроддзі камсамольцаў і несаюзнай моладзі актыўна ўдасканальвалася і паглыблялася, што ўмацоўвала эканоміку. У 1930-я гг. яно перарасло ў БССР у масавы рух працоўных юнакоў і дзяўчат. Пры гэтым калі ў 1933 – жніўні 1935 г. пераважнай яго формай быў ударніцкі рух, то з верасня 1935 г. і да канца вызначанага перыяду – стаханаўскі. Сацыялістычнае спаборніцтва спрыяла фарміраванню ў маладога пакалення такіх важных для грамадства якасцей, як высокі маральны дух, дысцыплінаванасць, адказнасць, калектывізм.

У другой палове 1930-х гг. нарэшце быў наладжаны належны кантроль ЛКСМБ за забеспячэннем выканання працоўнага заканадаўства ў адносінах да падлеткаў. Дзякуючы мэтанакіраванай працы камсамола, нягледзячы на ўсе цяжкасці, паступова раслі заробкі і паляпшаліся побытавыя ўмовы жыцця моладзі. Значнае паляпшэнне яе сацыяльна-эканамічнага становішча адбылося напрыканцы 1930-х гг.

Важнай формай прафесійнай падрыхтоўкі моладзі было навучанне на вытворчасці, але яно вялося бессістэмна і без праграм. З-за распаўсюджанасці дробных прадпрыемстваў асноўнай формай працоўнага навучання з'яўлялася індывідуальнае вучнёўства. Работа па навучанні юнакоў і дзяўчат на прадпрыемствах каардынавалася камсамольскімі арганізацыямі. Пры актыўным удзеле структур камсамола ўдасканальвалася заканадаўства аб навучанні на прадпрыемствах. Але часта яго нормы не вытрымліваліся, бо адсутнічаў належны кантроль з боку дзяржаўных органаў, структур прафсаюзаў і камсамола. Толькі ў 1930-я гг. сітуацыя карэнным чынам палепшылася.

Адной з самых складаных і балючых сацыяльных праблем моладзі Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. з'яўлялася беспрацоўе. Яно фактычна расло ўвесь азначаны перыяд, у першую чаргу за кошт малодшых узростаў, якія раней не працавалі. Таму камсамольскія структуры шмат увагі надавалі барацьбе з маладзёжным беспрацоўем праз арганізацыю юнсекцый пры біржах працы, браніраванне працоўных месцаў для падлеткаў на дзяржаўных і прыватных прадпрыемствах. Аднак толькі з пашырэннем прамысловага будаўніцтва ў выніку ажыццяўлення палітыкі індустрыялізацыі праблема маладзёжнага беспрацоўя ў пачатку 1930-х гг. была вырашана.

Нягледзячы на цяжкасці і складанасці, камсамольскія структуры надавалі значную ўвагу маніторынгу стану здароўя працоўнай моладзі. З удзелам іх былі створаны юнсекцыі пры цэнтральным апараце НКАЗ ССРБ і мясцовых аддзелах аховы здароўя, праводзіліся медагляды працуючых юнакоў і дзяўчат, арганізоўвалася іх дыетычнае харчаванне, прапагандаваўся здаровы лад жыцця. Аднак з-за недахопа матэрыяльных сродкаў толькі з другой паловы 1930-х гг., у значнай ступені дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці камсамольскіх структур, правядзенне медаглядаў працоўнай моладзі стала масавым і добраарганізаваным.

Таксама структуры камсамола Савецкай Беларусі, нягледзячы на цяжкасці і складанасці, вялі мэтанакіраваную плённую працу па ліквідацыі дзіцячай і падлеткавай беспрытульнасці, барацьбу з асацыяльнымі з'явамі ў маладзёжным асяроддзі, у тым ліку і сярод камсамольцаў.

Моладзь таксама ўдзельнічала ў барацьбе з беззаконнасцю і бюракратызмам праз узаемадзеянне з органамі РСІ і дзейнасць "лёгкай кавалерыі". Аднак праца "лёгкіх кавалерыстаў" працяглы час пакідала жадаць лепшага і характарызавалася перыядычнымі спадамі і ўздымамі. Тым не менш групы "лёгкай кавалерыі" аказалі істотную дапамогу ў барацьбе з бюракратызмам у кіруючым апараце, узняцці вытворчасці працы, паляпшэнні метадаў гаспадарання.

Па нашых падліках, за вызначаны перыяд камсамолам Савецкай Беларусі быў арганізаваны цэлы шэраг буйных акцый у адпаведным кірунку: 80 – па забеспячэнні сацыяльна-эканамічных правоў маладога пакалення; 15 – па арганізацыі падрыхтоўкі на прадпрыемствах і ва ўстановах работнікаў з ліку юнакоў і дзяўчат; 23 – па барацьбе з беспрацоўем моладзі; 30 – па ахове здароўя маладых працоўных; 46 – па пераадоленні асацыяльных з'яў у маладзёжным асяроддзі. У выніку мэтанакіраванай працы структур камсамола, нягледзячы на недахопы, былі дасягнуты значныя станоўчыя зрухі па ўсіх вышэйадзначаных напрамках.

Дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці камсамольскіх структур павялічваўся прыток моладзі ў прамысловую вытворчасць, раслі заробкі, паляпшаліся працоўныя і жыллёва-бытавыя ўмовы, узмацнялася дысцыпліна і ўдзел у гаспадарчым жыцці прадпрыемстваў. Пастпова расла практычная роля камсамольскіх арганізацый у развіцці прамысловасці. Пры гэтым асноўная маса камсамольцаў у прамысловай вытворчасці паказвала прыклады ўзорнай працы. У выніку, нягледзячы на цяжкасці і

недахопы, расла ўдзельная вага юнакоў і дзяўчат у прамысловасці, павялічваліся прадукцыйнасць іх працы і дысцыпліна, а таксама ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве, ініцыятыўнасць у справе пашырэння рэжыму эканоміі і рацыяналізацыі вытворчасці.

Камсамольскія структуры ажыццяўлялі працу па арганізацыі падрыхтоўкі з ліку юнакоў і дзяўчат, у першую чаргу камсамольцаў, кваліфікаваных кадраў работнікаў для прамысловасці. Асаблівая ўвага пры гэтым надавалася прафесійнаму навучанню падлеткаў непасрэдна на прамысловых прадпрыемствах. Дзякуючы актыўным намаганням структур камсамола прафесійная падрыхтоўка і кваліфікацыя маладых рабочых паступова паляпшалася.

Па нашых падліках, у азначаны перыяд камсамолам Савецкай Беларусі былі арганізаваны 184 значныя акцыі, накіраваныя на мадэрнізацыю айчыннай прамысловасці і забеспячэнне актыўнага ўдзелу маладога пакалення ў індустрыяльным будаўніцтве. З іх толькі 25 не дасягнулі пастаўленых мэт з-за крызісу кіравання ўнутры ЛКСМБ і перагружанасці яго камітэтаў і ячэек іншымі надзённымі справамі. Агульная большасць камсамольскіх ініцыятыў выклікала шырокі грамадскі рэзананс і падтрымку падрастаючага пакалення. Найбольшы водгук у маладзёжным асяроддзі мелі кампаніі павышэння вытворчасці працы, рацыяналізацыі, авалодання тэхнічнымі ведамі, сацыялістычнае спаборніцтва, прамысловы паход камсамольцаў і моладзі, падпіска на пазыкі індустрыялізацыі, мабілізацыі на будаўніцтва важных прамысловых аб'ектаў і інш.

З пачаткам новай эканамічнай палітыкі савецкія ўлады на вёсцы актыўна сталі прыцягваць маладое пакаленне да ажыццяўлення яе мерапрыемстваў. Асноўным рухавіком у гэтай справе выступалі арганізацыі камсамола. Камсамольцы таксама дапамагалі ўладам упарадкаваць землекарыстанне, аказвалі ўсебаковую дапамогу маламаёмасным сялянам і сем'ям чырвонаармейцаў, актыўна ўдзельнічалі ў пасяўных кампаніях, меліярацыйных работах, вялі працу па ўкараненні ў сельскую гаспадарку навуковых рэкамендацый і перадавога вопыту.

З 1923 г. пры вясковых ячэйках камсамола пачалося стварэнне сельскагаспадарчых гурткоў, у працу якіх былі ўцягнуты тысячы юнакоў і дзяўчат. Камсамольскае кіраўніцтва мэтанакіравана прадпрымала захады па паляпшэнні вясковай працы саюза. Рэгулярны характар набыла мабілізацыя камсамольцаў для работы на вёсцы. Формы ўдзелу структур ЛКСМБ у гаспадарчым жыцці сяла з кожным годам рабіліся ўсё больш разнастайнымі. З 1924 г. у вясковых ячэйках саюза пачалі праводзіцца конкурсы на лепшую сельскагаспадарчую работу. Павялічвалася дапамога сельскім камсамольцам з боку іх гарадскіх таварышаў.

У дзейнасці камсамола значная ўвага адводзілася развіццю калектыўных формаў вясковага гаспадарання. У першай палове 1920-х гг. асноўная ўвага ў гэтай справе надавалася саўгасам. У выніку ў іх паступова павялічвалася колькасць маладых работнікаў, хаця і захоўваліся праблемы ў сферы абароны інтарэсаў падлеткаў, працуючых па броні. Пры гэтым вельмі слабым быў удзел камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў іншых калектыўных формах арганізацыі сельскай гаспадаркі.

У другой палове 1920-х гг. арганізацыі камсамола актывізавалі ўдзел у кампаніях хлебанарыхтовак і калектывізацыі. Але напрыканцы 1920-х гг. у ЛКСМБ выразна праявіліся супрацьлеглыя падыходы ў адносінах да правядзення калектывізацыі. З аднаго боку, шэраг АК, РК і ячэек саюза скажалі лінію кампартыі ў калгасным будаўніцтве праз яго штучнае стымуляванне. З другога боку, унутры арганізацый ЛКСМБ актывізавалася праслойка, якая супрацьдзейнічала калектывізацыі.

Толькі ў пачатку 1930-х гг. пад ціскам ЦК ВЛКСМ структуры ЛКСМБ у сваёй дзейнасці на вёсцы пачалі аддаваць прыярытэт працы ў калгасах. Аднак слабай заставалася ўзгодненасць дзеянняў яго камітэтаў і ячэек са структурамі кампартыі, прафсаюзаў, НКЗ БССР. Мабілізацыі камсамольцаў у калгасы, саўгасы, МТС і МТМ праводзіліся непрадумана і паспешліва, адсутнічаў паўнавартасны ўлік патрэб у запаўненні вакансій.

Аднак удзел камсамольскіх камітэтаў і ячэек у калектывізацыі паступова павялічваўся, як і працэнт камсамольцаў у калгасах і іх кіраўніцтве. Пашыралася дзейнасць арганізацый камсамола па развіцці саўгасаў, МТС і МТМ. Дзякуючы мэтанакіраванай працы структур ЛКСМБ, у сціслыя тэрміны значна вырас практычны ўклад моладзі ў калектывізацыю, укараненне простых аграмерапрыемстваў. Юнакі і дзяўчаты актыўна ўдзельнічалі ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцкім руху ў сельскай гаспадарцы. Новай формай удзелу маладога пакалення ва ўдасканаленні сельскагаспадарчай вытворчасці стала арганізацыя па ініцыятыве ЦК камсамола рэспублікі пры камітэтах саюза маладзёжных сельскагаспадарчых станцый. У выніку з сярэдзіны 1930-х гг. камсамольцы і несаюзная моладзь займалі значнае месца ў развіцці сельскай гаспадаркі і выкананні ўсіх гаспадарчых кампаній на сяле.

Па нашых падліках, за перыяд, які разглядаецца намі, камсамол Савецкай Беларусі правёў 229 значных акцый, накіраваных на мадэрнізацыю сельскай гаспадаркі і забеспячэнне актыўнага ўдзелу ў гэтым працэсе маладога пакалення. З іх 161 была рэалізавана, хоць і з рознай ступенню паспяховасці, і толькі 68 пацярпелі няўдачу з-за крызісу кіравання ўнутры ЛКСМБ і перагружанасці яго камітэтаў і ячэек іншымі надзённымі справамі. Найбольш паспяховымі былі арганізацыя агракультурнага асветніцтва праз стварэнне сельскагаспадарчых гурткоў, кампаніі па ўзняцці вытворчасці працы, стварэнні ўзорных вытворчых участкаў, ссяленні хутароў, конкурсы на лепшую грамадска-гаспадарчую працу, паход за ўраджай і калектывізацыю сельскай гаспадаркі, агразаатэхнічны паход камсамольцаў і сельскай моладзі, шэфства над каняводствам, арганізацыя МТС, падрыхтоўка кадраў механізатараў, рух маладзёжных дазораў высокага ўраджаю, сацыялістычнае спаборніцтва.

**“Удзел моладзі ў разгортванні фізкультурна-спартыўнай і ваенна-патрыятычнай работы”**. Асабліва актыўную ролю ў шырокім разгортванні абаронна-масавай працы адыгралі камсамольскія арганізацыі, што паспрыяла ўмацаванню аўтарытэту камсамола ў маладзёжным асяроддзі і грамадстве ў цэлым. Акцыі і кампаніі, накіраваныя на развіццё ваенна-патрыятычнай працы і ўмацаванне абараназдольнасці краіны, ажыццяўляліся камсамольскімі структурамі ў цесным узаемадзеянні з органамі ўлады і кіравання, партыйнымі, прафсаюзнымі, абароннымі і іншымі грамадскімі арганізацыямі, а таксама сродкамі масавай інфармацыі. Пры гэтым важная роля адводзілася развіццю фізкультуры і спорту, у прыватнасці, яго ваенна-прыкладным відам, а таксама арганізацыі шэфства над вайсковымі часткамі, пашырэнню падрыхтоўкі дапрызыўнікаў да ваеннай службы, накіраванню лепшай моладзі ў вайсковыя навучальныя ўстановы.

У выніку сотні тысяч маладых людзей былі задзейнічаны ў развіцці фізкультурнага руху, сотні тысяч дапрызыўнікаў прайшлі неабходную ваенную падрыхтоўку, з ліку здольнай моладзі былі падрыхтаваны тысячы кваліфікаваных ваенных камандзіраў.

Паводле нашых падлікаў, за вызначаны перыяд камсамолам Савецкай

Беларусі быў арганізаваны цэлы шэраг буйных акцый у адпаведным кірунку: 165 – фізкультурных і спартыўных, 48 – па падрыхтоўцы дапрызыўнікаў да вайсковай службы, 53 – ваенна-патрыятычнага напрамку і 39 – ваенна-шэфскага, 19 – па накіраванні здольнай моладзі ў ваенна-навучальныя ўстановы. У выніку пры непасрэдным удзеле беларускіх камсамольскіх структур былі падрыхтаваны каля 146 тыс. фізкультурнікаў і спартсменаў, каля 10 тыс. афіцэраў, звыш 18 тыс. аўтамабілістаў і 35 тыс. кавалерыстаў, каля 26 тыс. парашутыстаў і 8 тыс. планерыстаў, больш за тысячу лётчыкаў; пачатковую ваенную падрыхтоўку прайшлі каля 380 тыс. дапрызыўнікаў; у Асаавіяхім былі ўцягнуты каля 247 тыс. юнакоў і дзяўчат, нормы комплексаў "Варашылаўскага стралка" здалі каля 109 тыс. маладых людзей, "Гатовы да працы і абароны" – каля 137 тыс., "Гатоў да супрацьпаветранай і проціхімічнай абароны" – каля 125 тыс., "Готоў да санітарнай абароны" – каля 31 тыс.

Увогуле, дзякуючы створанай пры актыўным удзеле камсамола сістэме ваенна-патрыятычнага выхавання, моладзь прадэманстравала ў час ваенных падзей вялікі патрыятычны ўздым і здольнасць абараніць Айчыну.

Дзяржаўныя органы, структуры кампартыі, прафсаюзы і камсамольскія арганізацыі з пачатку 1920-х гг., нягледзячы на цяжкасці і недахопы, ажыццяўлялі мэтанакіраваную працу па развіцці маладзёжнага фізкультурнага руху, выкарыстоўваючы яго не толькі ў мэтах умацавання здароўя юнакоў і дзяўчат, але і для ўзмацнення абараназдольнасці краіны і выхавання падрастаючага пакалення ў духу патрыятызму.

Разам з тым да сярэдзіны 1930-х гг. маладзёжная фізкультура слаба развівалася на вёсцы, ды і ў горадзе маладое пакаленне ўцягвалася ў яе павольна. Адмоўна адбівалася на гэтым працэсе саперніцтва паміж кіраўніцтвам ЛКСМБ і прафсаюзаў у справе разгортвання фізкультурнай працы сярод моладзі. З-за недахопу матэрыяльных сродкаў марудна павялічвалася колькасць планерыстаў, авіямадэлістаў і аэраклубаў, а таксама юнакоў і дзяўчат, якія здалі нормы абаронных комплексаў і ваенна-тэхнічны экзамен.

Толькі з другой паловы 1930-х гг. у выніку падтрымкі і дапамогі з боку партыйных і дзяржаўных органаў арганізацыі камсамола і Асаавіяхіма БССР разгарнулі інтэнсіўную працу па развіцці масавага маладзёжнага ваенна-спартыўнага руху. У выніку значна павялічылася колькасць фізкультурных і спартыўных мерапрыемстваў з удзелам моладзі, вырасла колькасць юнакоў і дзяўчат, якія здалі нормы абаронных комплексаў. Увогуле, калі ў пачатку 1920-х гг. фізкультурай і спортам у Савецкай Беларусі займаліся сотні маладых людзей, то напрыканцы 1930-х гг. – сотні тысяч.

Значная ўвага ў дзейнасці структур камсамола Савецкай Беларусі адводзілася ваенна-шэфскай працы па розных напрамках. У шэфства ўцягвалася і несаюзная моладзь.

Аднак у шэфскай дзейнасці да другой паловы 1930-х гг. меліся значныя недахопы: існавала хранічная запазычанасць па шэфскіх узносах, хаця паступова паступленне сродкаў паляпшалася; слаба падтрымлівалася непасрэдная сувязь з падшэфнымі структурамі; адсутнічала якасная прапаганда шэфства.

Тым не менш, нягледзячы на складанасці і цяжкасці, кіраўніцтва ЛКСМБ пры падтрымцы партыйных і дзяржаўных органаў вяло мэтанакіраваную працу па паляпшэнні ваенна-шэфскай дзейнасці. Саюз аказваў даволі значную фінансавую дапамогу падшэфным структурам, з'яўляліся новыя формы яго шэфства над вайсковымі часткамі, што давала станоўчыя вынікі. Асабліва актыўна развівалася камсамольскае шэфства над лінкорам "Парижская коммуна", авіячасткамі БВА і пагранвойскамі.

У выніку ў другой палове1930-х гг. арганізацыя ваенна-шэфскай працы значна палепшылася, шырока разгарнулася шэфства камсамольскіх арганізацый над асобнымі вайсковымі часткамі і ўзаемадзеянне з імі ў справе навучання моладзі ваенным спецыяльнасцям.

У цэлым ваенна-шэфская дзейнасць камсамола Савецкай Беларусі адыграла вялікую ролю ў паляпшэнні падрыхтоўкі маладога пакалення да абароны Радзімы і ўзняцці баяздольнасці вайсковых частак.

Як бачна, падрыхтоўка маладога пакалення да абароны Радзімы, ваенна-патрыятычнае выхаванне юнакоў і дзяўчат з'яўлялася адным з важнейшых напрамкаў працы камсамола і абаронных таварыстваў у Савецкай Беларусі.

У цэлым 1920-я гг. былі часам пошуку аптымальных форм маладзёжнай абаронна-масавай працы. Тым не менш у гэтай дзейнасці не хапала планавасці і сістэмнасці, актыўнага ўдзелу ўсіх камсамольскіх структур і належнага іх ўзаемадзеяння з ваеннымі органамі, прафсаюзамі і абароннымі таварыствамі. З 1927 г. ключавую ролю ў ажыццяўленні падрыхтоўкі маладога пакалення да абароны Айчыны адыгрывалі арганізацыі ЛКСМБ і Асаавіяхіма. Разгорнутая імі актыўная агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць значна павялічыла зацікаўленасць маладых людзей у атрыманні неабходных вайсковых ведаў. Правядзенне ваенізаваных манеўраў і паходаў, нягледзячы на цяжкасці і недахопы, садзейнічала павелічэнню аўтарытэту камсамола ў маладзёжным асяроддзі, росту дысцыплінаванасці камсамольцаў, спрыяла ўзмацненню ўдзелу юнакоў і дзяўчат у працы Асаавіяхіма. Але дамагчыся масавага ахопу моладзі ваеннай вучобай яшчэ не ўдалося. Больш шырокаму разгортванню абаронна-масавай працы перашкаджалі абмежаваныя матэрыяльныя магчымасці дзяржавы і грамадскіх арганізацый, слабая выканаўчая дысцыпліна, імкненне да колькасных, а не якасных паказчыкаў.

Значнае ўзмацненне ваенна-патрыятычнай працы з маладым пакаленнем адбылося ў 1930-я гг. Дзякуючы падтрымцы з боку партыйных і дзяржаўных органаў, арганізацыі ЛКСМБ і Асаавіяхіма, нягледзячы на недахопы, разгарнулі інтэнсіўную працу па масавым вайсковым навучанні без адрыву ад вытворчасці. Былі дасягнуты несумнеўныя поспехі, хаця і назіраліся шматлікія факты фармалізму і пагоні толькі за колькаснымі паказчыкамі. Таксама было наладжана ўзаемадзеянне камсамола з Чырвоным Крыжам. Асабліва эфектыўнай формай ваенна-патрыятычнага выхавання ў гэтыя гады сталі ваенізаваныя паходы, вучэнні і гульні. Яны выразна прадэманстравалі вялікі патрыятычны ўздым і гатоўнасць юнакоў і дзяўчат да абароны Айчыны. Шырока распаўсюдзіліся камсамольскія сацыялістычныя спаборніцтвы па арганізацыі абароннай работы. З другой паловы 1930-х гг. змест абаронна-масавай працы ЛКСМБ паглыбіўся, адрозніваўся

большым размахам і разнастайнасцю. У выніку ў ваенна-патрыятычную працу былі ўцягнуты сотні тысяч юнакоў і дзяўчат.

## Асноўныя навуковыя вынікі

1. У Савецкай Беларусі пад уплывам кампартыі ажыццяўлялася мэтанакіраваная разбудова структур камсамола як цэнтра гуртавання моладзі краіны. У працэсе станаўлення і развіцця камсамола Савецкай Беларусі ў 1921–1939 гг. можна выдзяліць чатыры перыяды.

Першы перыяд ахоплівае 1921–1923 гг. Гэта быў час арганізацыйнага станаўлення КСМБ. Адпаведныя пытанні пастаянна разглядаліся на пасяджэннях партыйных і камсамольскіх органаў, іх вырашэнне адбывалася таксама з дапамогай частага склікання з’ездаў саюза. Агульнымі намаганнямі назапашваўся неабходны вопыт, умацоўвалася структура саюза. У КСМБ пераважала яўрэйская моладзь. Напрыканцы 1923 г. ён налічваў 6 паветгаркамаў, 2 ГК з 4 РК, 315 ячэек, звыш 5 тыс. членаў і кандыдатаў.

Другі перыяд ахоплівае 1924–1927 гг., калі адбывалася арганізацыйная разбудова саюза. З 1924 г. сярод яго членаў сталі пераважаць беларусы. Кіраўніцтва ЛКСМБ санкцыянавала ўзмацненне ўнутрысаюзнай дэмакратыі. Дзякуючы прадпрынятым захадам, у дзейнасці ЛКСМБ стала назірацца большая планавасць, павелічэнне “жывога” і скарачэнне “папяровага” кіраўніцтва. Праведзеная работа станоўча паўплывала на рост радоў і структуры саюза. Намаганнямі камсамольскіх лідараў і пры падтрымцы партыйных камітэтаў да канца 1927 г. удалося заснаваць 12 акруговых і 111 раённых камітэтаў, 2300 ячэек, якія аб’ядноўвалі больш за 62 тыс. членаў і кандыдатаў.

Трэці перыяд ахоплівае 1928–1933 гг. У гэты час ЛКСМБ перажываў сістэмны арганізацыйны крызіс. Для выпраўлення сітуацыі ў 1930 г. была праведзена рэарганізацыя апарату ЦК і мясцовых камітэтаў ЛКСМБ. ЦК ВЛКСМ упершыню накіраваў сваіх прадстаўнікоў для вывучэння становішча ў ЛКСМБ і выпрацоўкі разам са структурамі кампартыі прапаноў па яго паляпшэнні. У выніку адбылася даволі значная чыстка камсамола БССР. Некаторыя ячэйкі і РК ЛКСМБ былі распушчаны. Нягледзячы на гэта, у камсамоле рэспублікі захоўвалася складанае становішча. У саюзе не хапала кадраў актывістаў. Акрамя таго ў 1932 г. ЦК ЛКСМБ быў расколаты з-за ўнутранага канфлікту груп актывістаў, што падарвала кіруемасць саюза. У 1933 г. 111 РК камсамола рэспублікі налічвалі каля 5300 ячэек, якія аб’ядноўвалі каля 109 тыс. членаў і кандыдатаў. Але колькасны рост саюза ішоў самацёкам. У ім значна вырасла колькасць “класава чужых” і варожых элементаў, у тым ліку сярод актыву і нават у кіраўніцтве шэрагу РК. З-за адсутнасці адпаведнага кантролю больш паловы камсамольцаў фактычна не ўдзельнічалі ў жыцці арганізацыі. З мэтай выпраўлення сітуацыі ЦК ВКП(б) у 1933 г. прыпыніў далейшы колькасны рост ЛКСМБ да рашэння ЦК ВЛКСМ.

Чацвёрты перыяд ахоплівае 1934–1939 гг., калі адбываўся паступовы выхад з крызісу і пераадоленне арганізацыйных складанасцей. Рашэнне аб прыпыненні колькаснага росту ЛКСМБ скарацiла колькасць яго членаў амаль у 2 разы. Толькі з 1936 г. пачалося пашырэнне радоў камсамольцаў. З-за барацьбы з апазіцыяй сістэматычны характар набыла самаачыстка шэрагаў ЛКСМБ ад “класава чужых” і варожых элементаў. У выніку ў саюзе не хапала кіруючых кадраў. У 1937 г. у сувязі з фінальнай стадыяй барацьбы за ўладу паміж І. Сталіным і яго праціўнікамі становішча

ўнутры камсамола БССР стала крытычным. Гэта зноў прывяло да ўмяшання ў яго справы ЦК ВЛКСМ і ЦК ВКП(б), што выклікала хвалю выкрыцця ў ЛКСМБ “ворагаў народа”. Цэлы шэраг пярвічных арганізацый саюза распаліся. Сітуацыя ў ЛКСМБ больш-менш стабілізавалася толькі ў канцы 1938 г. з дапамогай ЦК КП(б)Б. Камсамольскі актыў і кіруючыя кадры саюза амаль поўнасцю абнавіліся. У пачатку 1939 г. узмацнілася актыўнасць камсамольцаў, значна вырасла іх колькасць. Была выпрацавана добракіраваная сістэма камсамольскіх органаў. ЛКСМБ налічваў 5 абкамаў, 92 РК, 5 ГК і каля 11100 пярвічных арганізацый, якія аб’ядноўвалі амаль 225 тыс. членаў і кандыдатаў.

2. Сацыяльна-палітычныя пераўтварэнні стварылі ўмовы для разгортвання нацыянальнага маладзёжнага руху, які пакінуў адметны след у грамадска-палітычным жыцці.

У першай палове 1920-х гг. у Савецкай Беларусі дзейнічалі больш 20 невялікіх беларускіх маладзёжных гурткоў. Але ім так і не ўдалося стварыць уласны каардынацыйны цэнтр, што сведчыць аб слабасці беларускага нацыянальнага руху ў асяроддзі юнакоў і дзяўчат. Са свайго боку ўлады падвяргалі праследаванням беларускія нацыянал-дэмакратычныя маладзёжныя арганізацыі. У выніку легальныя маладзёжныя беларускія аб’яднанні некамуністычнай накіраванасці як на тэрыторыі БССР, так і ў іншых савецкіх рэспубліках спынілі сваю дзейнасць у першай палове 1920-х гг. Праявы ж нелегальнай дзейнасці падобных груповак былі нешматлікімі, бо ўладам разам з камсамолам удалося забяспечыць патрэбы нацыянальна-культурнага развіцця пераважнай большасці беларускай моладзі.

Развіццё арганізацый яўрэйскай моладзі адбывалася па двух напрамках: камуністычным і сіянісцкім. У пачатку 1920-х гг. яўрэі актыўна спрабавалі захаваць на камуністычным палітычным полі асобны маладзёжны яўрэйскі сектар у выглядзе ЯКСМ, які да 1923 г. з’яўляўся рэальным канкурэнтам камсамола ў асяроддзі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат. Аднак з-за супрацьдзеяння ўлад наладзіць працу ЯКСМ не ўдалося. Сярод сіянісцкіх маладзёжных арганізацый Савецкай Беларусі выразна вылучаліся тры групы: правыя, адукацыйна-культурныя і левыя. Да правых адносіліся Арганізацыя сіянісцкай моладзі і іншыя больш дробныя групоўкі; да адукацыйна-культурных – Гашомер-Гацаір, Гехавер, Гехалуц, Макабі; да левых – ЯССРМ “ЮПЦ”, СССМ і Цэірэй Цыён. Пры гэтым калі ў першай палове 1920-х гг. найбольш буйной арганізацыяй з’яўляўся Гехалуц, то ў другой палове – СССМ. Дзякуючы добра распрацаванай сістэме працы сярод розных пластоў яўрэйскай моладзі колькасны склад маладзёжных сіянісцкіх арганізацый дасягнуў найбольшых паказчыкаў у 1925 г. Аднак у выніку адсутнасці адзінства ў сіянісцкім руху, узмацнення процідзеяння ўлад, паляпшэння экнамічнага становішча яўрэйскіх юнакоў і дзяўчат з канца 1926 г. уплыў маладзёжных сіянісцкіх арганізацый слабеў і адбываўся распад іх мясцовых структур. Апошняя спроба актывізацыі працы сіяністаў сярод яўрэйскай моладзі была прадпрынята лідарамі руху напрыканцы 1920-х гг.

Пры гэтым шэраг арганізацый ЛКСМБ нейтральна адносіліся да дзейнасці нацыянал-дэмакратаў і сіяністаў, а асобныя звенні нават патрапілі пад іх уплыў. Такое становішча тлумачыцца адсутнасцю ў кіраўніцтве кампартыі і камсамола адзіных падыходаў да вырашэння нацыянальнага пытання і ўнутранай барацьбой прыхільнікаў розных ідэйных установак. Дзейнасць некамуністычных структур і плыняў адцягвала значную колькасць моладзі, ускладняла пашырэнне радоў камсамола і распаўсюджванне камуністычных ідэй у маладзёжным асяроддзі. Тым не менш у выніку правядзення ўладамі і кампартыяй палітыкі па выцясненні з грамадска-палітычнага поля альтэрнатыўных маладзёжных арганізацый камсамол з другой

паловы 1920-х гг. з'яўляўся адзінай афіцыйнай арганізацыяй моладзі.

3. Кіраўніцтва кампартыі арганізоўвала палітасвету юнакоў і дзяўчат, абапіраючыся на камсамольскія структуры. Усяго за азначаны перыяд, па нашых падліках, структуры камсамола правялі 28 значных акцый і кампаній, накіраваных на пашырэнне палітасветы маладога пакалення. Увогуле ў арганізацыі палітасветы моладзі Савецкай Беларусі можна вылучыць чатыры перыяды.

Першы ахоплівае 1921–1923 гг., калі адбывалася станаўленне сістэмы маладзёжнай палітасветы. Пашырэнне палітасветы стрымлівалася агульным невысокім узроўнем адукацыі падрастаючага пакалення, недахопам кваліфікаваных кіраўнікоў, спецыяльнай метадычнай літаратуры і фінансавых сродкаў. Тым не менш у канцы 1923 г. у Савецкай Беларусі дзейнічалі больш за 200 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол. Усяго палітвучобай было ахоплена каля 16 тыс. юнакоў і дзяўчат.

Другі прыпадае на 1924–1928 гг., калі, нягледзячы на складанасці, адбывалася паступальнае развіццё сістэмы палітасветы. Камітэты і ячэйкі камсамола паступова актывізавалі палітасвету, выкарыстоўвалі розныя яе формы. У 1927/28 н. г. амаль усе камсамольцы рэгулярна займаліся ў палітшколах і палітгуртках. У 1928 г. у БССР працавалі каля 1500 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол, дзе навучаліся больш за 37 тыс. маладых людзей.

Трэці перыяд прыходзіцца на 1929–1935 гг., калі з-за радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў адбыўся фактычны заняпад палітасветы. З-за недахопу сіл і сродкаў для арганізацыі і кантролю маладзёжная палітасветная сетка ў большасці раёнаў была развалена. Становішча пагаршалася з-за заблытанасці палітычнай сітуацыі ў сувязі з дзейнасцю апазіцыі, якая выступала супраць палітыкі І. Сталіна і ўсяляк імкнулася яе дыскрэдытаваць, а таксама з-за арганізацыйнага крызісу ўнутры ЛКСМБ. Адчуваўся недахоп кваліфікаваных камсамольскіх паліткіраўнікоў і неабходнай літаратуры. Выразна прасочваўся крызіс сістэмы камсамольскай палітасветы. Да 1935 г. палітасветай было ахоплена толькі каля 30 тыс. маладых людзей.

Чацвёрты перыяд ахоплівае 1936–1939 гг. і характарызуецца арганізацыйным аднаўленнем і пашырэннем сістэмы палітасветы, паляпшэннем яе якасці. У выніку актывізацыі адпаведнай работы партыйных і камсамольскіх органаў паступова адбываўся выхад сістэмы палітвучобы моладзі з крызіснага становішча, пашыралася сетка палітасветных устаноў і паляпшалася якасць іх працы. Напрыканцы 1930-х гг. была створана разгалінаваная і добракіраваная сістэма палітвучобы маладога пакалення. Ёй былі ахоплены ўсе члены ЛКСМБ і большасць моладзі БССР. Так, у 1939 г. працавалі каля 8200 камсамольскіх палітгурткоў і палітшкол, у якіх навучаліся каля 225 тыс. камсамольцаў і каля 40 тыс. несаюзных юнакоў і дзяўчат.

4. Кіраўніцтва кампартыі адводзіла камсамолу важную ролю ў сістэме кіравання краінай. Прадметам асаблівай увагі кіраўніцтва кампартыі і дзяржавы, а таксама камсамола было пашырэнне ў структурах дзяржаўных органаў праслойкі камсамольцаў і моладзі, што забяспечвала устойлівасць улады і эвалюцыйную яе пераемнасць. Разам з тым узаемадзеянне дзяржаўных органаў з моладдзю і з камсамолам, а таксама сістэмная арганізацыя працы камсамольцаў у органах улады і кіравання былі належным чынам арганізаваны толькі ў 1930-я гг. Тым не менш, нягледзячы на недапрацоўкі і складанасці, пашыраўся ўдзел маладых людзей у працы структур дзяржаўнага апарату. Калі ў пачатку 1920-х гг. гэта былі адзінкі, то напрыканцы ўказанага перыяду – дзясяткі тысяч.

Назіралася тэндэнцыя павелічэння прадстаўніцтва моладзі ў саветах. Аднак на

працягу 1920-х гг. у камсамоле Савецкай Беларусі адсутнічала добра адпрацаваная і зладжаная сістэма ўдзелу ў перавыбарах саветаў і арганізацыі працы камсамольцаў-дэпутатаў. Рост колькасці членаў камсамола ў саветах быў нестабільны, бо часта камсамольскія ячэйкі выступалі неарганізавана, самі камсамольцы не мелі яшчэ трывалага аўтарытэту сярод насельніцтва. Тым не менш палітыка вылучэння камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў саветы не спынялася і ў 1930-я гг. Камсамольскія арганізацыі дэманстравалі высокую актыўнасць у час выбараў. У саветах расла колькасць камсамольцаў, але іх удзельная вага сярод маладых дэпутатаў скарачалася. Такое становішча сведчыць як аб значнай грамадскай актыўнасці юнакоў і дзяўчат у той час, так і аб наяўнасці сістэмнай дзяржаўнай палітыкі па актыўным прыцягненні здольнай моладзі да працы ў саветах незалежна ад яе прыналежнасці да камсамола. Так, калі ў пачатку 1920-х гг. гэта былі дзясяткі, то напрыканцы ўказанага перыяду – дзясяткі тысяч.

5. Камсамол імкнуўся аказваць актыўны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё маладога пакалення праз арганізацыю разнастайных мерапрыемстваў і пашырэнне свайго прадстаўніцтва ў грамадскіх арганізацыях.

Адным з кірункаў дзейнасці камсамола з'яўляўся ўдзел у рабоце прафсаюзных арганізацый. Тым не менш да сярэдзіны 1920-х гг. камсамольцы, абраныя ў праформаны, працавалі слаба. У выніку прафсаюзы мала надавалі ўвагі рабоце сярод моладзі. У канцы 1920-х – другой палове 1930-х гг., нягледзячы на ўсё больш узрастаючую актыўнасць маладых людзей у прафсаюзным руху, камітэты і ячэйкі ЛКСМБ прымалі недастатковы ўдзел у перабудове працы прафсаюзаў. Невялікай заставалася і камсамольская праслойка ў прафсаюзным апараце. Гэта тлумачыцца як адсутнасцю належнай увагі кіраўніцтва саюза да адпаведнай працы, так і непаразуменнямі ва ўзаемаадносінах з кіраўніцтвам прафсаюзаў. Разам з тым камсамольцамі з'яўляліся менш паловы маладых членаў прафсаюзаў, што сведчыць аб большай у параўнанні з камсамолам прыцягальнасці прафсаюзных арганізацый для маладога пакалення. У прафсаюзным руху надавалася асаблівая ўвага працы са студэнцтвам, што яскрава праявілася ў стварэнні для гэтай мэты асобных прафсаюзных структур. Ліквідацыя ж напрыканцы 1930-х гг. асобнага кіруючага органа для студэнтаў – членаў прафсаюзаў з'явілася вынікам палітычнай барацьбы ўнутры кампартыі і сведчыць аб тым, што ён не апраўдаў спадзяванняў партыйнага кіраўніцтва. Тым не менш, дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх арганізацый, колькасць моладзі ў прафсаюзах вырасла з некалькіх тысяч у пачатку 1920-х гг. да больш 100 тыс. у канцы 1930-х гг. Але дасягнуць канчатковага станоўчага пералому ў іх працы з юнакамі і дзяўчатамі ў разглядаемы перыяд так і не ўдалося.

Партыйныя, дзяржаўныя і камсамольскія органы надавалі значную ўвагу развіццю кааператыўнага руху ў маладзёжным асяроддзі. Заахвочвалася ўключэнне ў кааператыўнае кіраўніцтва як камсамольцаў, так і несаюзнай моладзі. Са стварэннем з 1925 г. спрыяльных умоў для развіцця кааперацыі і ўцягнення ў яе юнакоў і дзяўчат з дапамогай шэрага льгот актыўнасць моладзі ў кааператыўным руху пачала расці. Найбольш павялічвалася прадстаўніцтва маладога пакалення ў спажывецкім і крэдытным каапераванні, значна слабей – у сельскагаспадарчым і прамысловым. Пры гэтым члены камсамола напрыканцы 1920-х гг. складалі сярод маладых кааператыўных кіраўнікоў толькі крыху больш трэці. З другой паловы 1920-х гг. камітэты і ячэйкі камсамола праводзілі планавую працу па масавым пашырэнні кааперацыі сярод насельніцтва. Структурам саюза даводзілася весці барацьбу з заможнымі сялянамі за кантроль над кааперацыяй на вёсцы. У 1930-я гг. удзел моладзі

ў каапэратыўным руху развіваўся ў асноўным пад патранажам ЛКСМБ.

Па нашых падліках, за вызначаны перыяд структурамі камсамола Савецкай Беларусі былі праведзены 65 значных грамадска-палітычных кампаній, а таксама 48 буйных акцый па падрыхтоўцы дапрызыўнікаў да вайсковай службы, 53 – ваенна-патрыятычнага напрамку і 39 – ваенна-шэфскага, 19 – па накіраванні здольнай моладзі ў ваенна-навучальныя ўстановы. У выніку пры непасрэдным удзеле беларускіх камсамольскіх структур былі падрыхтаваны каля 10 тыс. афіцэраў, звыш 18 тыс. аўтамабілістаў і 35 тыс. кавалерыстаў, каля 26 тыс. парашутыстаў і 8 тыс. планерыстаў, больш за тысячу лётчыкаў; пачатковую ваенную падрыхтоўку прайшлі каля 380 тыс. дапрызыўнікаў; у Асаавіяхім былі ўцягнуты каля 247 тыс. юнакоў і дзяўчат, нормы комплексаў "Варашылаўскага стралка" здалі каля 109 тыс. маладых людзей, "Гатовы да працы і абароны" – каля 137 тыс., "Гатоў да супрацьпаветранай і процігімічнай абароны" – каля 125 тыс., "Готоў да санітарнай абароны" – каля 31 тыс.

Але ў саюзе фактычна да другой паловы 1930-х гг. адсутнічала сістэма працы камсамольцаў у грамадскіх структурах, назіраўся ў значнай ступені фармальны падыход да гэтай справы. Таму павелічэнне колькасных паказчыкаў не заўсёды суправаджалася высокай якасцю працы. У цэлым у грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат у азначаны перыяд назіралася тэндэнцыя нестабільнасці. Тым не менш, дзякуючы мэтанакіраванай працы камсамольскіх структур, камсамол стаў галоўнай арганізуючай сілай грамадска-палітычнага жыцця шырокіх мас маладога пакалення. Большасць камсамольцаў і несаюзнай моладзі падтрымлівалі палітыку партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва, што сведчыць аб несумненным поспеху ўлад у падпарадкаванні маладога пакалення свайму ўплыву.

6. Камсамольскія структуры, а таксама навучэнцы, рабфакаўцы і студэнты разгарнулі з пачатку 1920-х гг. працу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод маладога пакалення. Але планавай гэта дзейнасць стала толькі ў 1924/25 н. г., калі камітэты і ячэйкі камсамола распаўсюдзілі яе і на дарослых асоб. У выніку ўжо ў другой палове 1920-х гг. большасць моладзі БССР з'яўлялася пісьменнай. У першай палове 1930-х гг. камітэты і ячэйкі ЛКСМБ працягвалі актыўную працу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці, павелічэнні колькасці членаў і ўмацаванні таварыства "Прэч няпісьменнасьць". Аднак у пачатку другой паловы 1930-х гг. з-за выкліканай абвастрэннем унутрыпартыйнай барацьбы чысткі камсамола БССР і рэпрэсій у адносінах да яго кіраўніцтва дзейнасць структур саюза па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці замарудзілася. Тым не менш актыўны ўдзел у ліквідацыі непісьменнасці па-ранейшаму прымалі студэнты. У цэлым, дзякуючы плённай дзейнасці камсамольскіх арганізацый і студэнцкай моладзі, улады БССР дамагліся значных поспехаў у барацьбе з непісьменнасцю і малапісьменнасцю. Калі ў пачатку 1920-х гг. штогадовая колькасць людзей, навучаных камсамольцамі і студэнтамі пісьменнасці, лічылася сотнямі, то напрыканцы вызначанага перыяду – сотнямі тысяч. Сярод маладога пакалення непісьменнасць была амаль цалкам ліквідавана.

З пачатку 1920-х гг. камсамольцы актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні агульнаадукацыйных школ. З 1926 г. кіраўніцтва ЛКСМБ вяло працу ў напрамку ўвядзення ўсеагульнага абавязковага навучання. Разам з тым з 1927 г. моладзь ужо складала большасць сярод настаўнікаў БССР. Камсамольцы ажыццяўлялі вялікую дапамогу дзяржаўным органам ва ўзняцці агульнаадукацыйнага ўзроўню маладых працоўных праз пашырэнне сеткі ШРМ і ШСМ (ШКМ), а таксама праз арганізацыю вячэрняй адукацыі. У 1930-х гг. камітэты і ячэйкі ЛКСМБ актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы школ да навучальнага года і ажыццяўленні ўсенавуча, хаця шэфства

саюза над ім не было пазбаўлена недахопаў. Паступова ўзмацнялася ўзаемадзеянне камсамольцаў і настаўнікаў, удзел камсамольскіх арганізацый ва ўнутрышкольных справах.

Па нашых падліках, камсамольскія структуры Савецкай Беларусі на працягу перыяду, што разглядаецца, правялі 115 адпаведных значных акцый: 28 – па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці і 77 – па развіцці і ўмацаванні школьнай адукацыі.

Камсамольскія камітэты і ячэйкі актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў працоўных ва ўстановах пачатковай прафесійнай адукацыі. Важную ролю ў гэтым працэсе адыгрывалі школы прафесійнага навучання і школы ФЗН. З сярэдзіны 1920-х гг. пры актыўным удзеле структур камсамола і прафсаюзаў пашыралася падрыхтоўка працоўных кадраў з моладзі праз розныя курсы і гурткі. У 1930-я гг. была створана і плённа функцыянавала разгалінаваная сетка прафесійна-тэхнічных школ, курсаў і гурткоў, якія адыгралі вялікую ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных маладых працоўных. Мэтанакіраваная праца партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх органаў, нягледзячы на шматлікія цяжкасці і складанасці, прывяла да значнага пашырэння падрыхтоўкі кадраў кваліфікаваных працоўных з ліку моладзі. Так, калі ў пачатку 1920-х гг. ва ўстановах пачатковай прафесійнай адукацыі навучаліся тысячы юнакоў і дзяўчат, то напрыканцы вызначанага перыяда – дзясяткі тысяч.

Важную ролю ў камплектаванні ССНУ і ВНУ выхадцамі з рабочых і сялян адыгрывалі рабфакі, якія ствараліся і працавалі пры актыўным удзеле камітэтаў камсамола. Нацыянальны і сацыяльны склад рабфакаўцаў паступова змяняўся. Калі ў пачатку 1920-х гг. сярод іх пераважала яўрэйская рабочая моладзь, то з сярэдзіны 1920-х гг. – маладыя сяляне-беларусы. Толькі напрыканцы 1920-х гг. спецыялізацыя рабфакаў па галінах вытворчасці паспрыяла значнаму павелічэнню ўдзельнай вагі сярод іх навучэнцаў рабочых. Разам з тым колькасць рабфакаўцаў вырасла з менш 100 у 1920/21 н. г. да амаль 12 тыс. у 1934/35 н. г. Аднак з пашырэннем сеткі дзесяцігадовых агульнаадукацыйных школ колькасць іх навучэнцаў скарацілася да некалькіх соцень напрыканцы вызначанага перыяду.

Падборам і дэлегаваннем моладзі на рабфакі, у ССНУ і ВНУ займаліся структуры кампартыі, камсамола і прафсаюзаў з мэтай забеспячэння пераважна рабоча-сялянскага складу студэнтаў. З 1922 г. перыядычна праводзіліся чысткі студэнцтва, якія ажыццяўляліся пераважна на аснове класавага падыходу. Пры гэтым, нягледзячы на ўсе захады, сярод прынятых на рабфакі, у ССНУ і ВНУ ў 1920-я гг. па сацыяльным паходжанні пераважалі сяляне і так званыя іншыя сацыяльныя групы. Тым не менш у выніку мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкі з пачатку 1930-х гг. у студэнцкім асяроддзі дамінавалі выхадцы з рабочых і сялян. Але з адменай сацыяльных абмежаванняў пры паступленні ў ССНУ і ВНУ колькасць выхадцаў з рабочых і сялян сярод студэнтаў зноў пачала скарачацца. Пры гэтым на другое па колькасці месца пасля студэнтаў з рабочых выйшлі студэнты нерабоча-сялянскага паходжання. У першай палове 1920-х гг. сярод студэнтаў пераважалі яўрэі. Рашаючае ўздзеянне на змену нацыянальнага складу студэнцтва аказала палітыка беларусізацыі. У выніку паступова сярод студэнтаў беларусы пачалі складаць большасць.

Дзякуючы мэтанакіраваным захадам улад, актыўнай дзейнасці камсамольскіх арганізацый, колькасць студэнцтва ў Савецкай Беларусі за перыяд, што разглядаецца намі, павялічылася з каля 8 тыс. чалавек да больш 50 тыс., палепшылася і якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Сур'ёзная ўвага звярталася на патрыятычнае выхаванне і ідэйна-палітычную асвету студэнтаў. Гэтыя пытанні знаходзіліся пад асаблівай увагай структур камсамола. Такі падыход спрыяў фарміраванню творча

актыўнай, адданай свайму народу маладой інтэлігенцыі.

З 1920-х гг. камсамол Савецкай Беларусі вёў працу па распаўсюджванні сярод юнакоў і дзяўчат навукова-тэхнічных ведаў. Камітэты і ячэйкі ЛКСМБ паступова актывізавалі дзейнасць на ніве падрыхтоўкі маладых навуковых кадраў.

У цэлым, па нашых падліках, камсамольскія структуры Савецкай Беларусі на працягу вызначанага перыяду правялі 77 значных акцый, накіраваных на развіццё і ўмацаванне сістэмы сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, пашырэнне ў маладзёжным асяроддзі навуковых ведаў.

7. Прыярытэт у дзяржаўнай нацыянальнай палітыцы сярод моладзі мела выхаванне яе ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізма і брацкай садружнасці народаў. Ва ўдзеле моладзі ў нацыянальна-культурным жыцці ў міжваенны перыяд можна вылучыць чатыры этапы.

Першы ахоплівае 1921–1924 гг. і вызначаецца актыўнай нацыянальна-культурнай працай невялікіх груп моладзі. З 1923 г. і кіраўніцтва КСМБ шмат увагі звяртала на ажыццяўленне беларусізацыі.

Другі прыпадае на 1925–1928 гг. і характарызуецца актывізацыяй удзелу юнакоў і дзяўчат у нацыянальна-культурным будаўніцтве, выразным арганізацыйным афармленнем нацыянальна-культурнай працы ЛКСМБ у маладзёжным асяроддзі. Пры гэтым сярод моладзі нацыянальных меншасцей прыярытэт аддаваўся працы з яўрэямі, палякамі і латышамі. У 1928 г. беларусізацыя ў ЛКСМБ дасягнула свайго піку.

Трэці прыходзіцца на 1929–1934 гг. і адметны спадам тэмпаў нацыянальна-культурнай працы сярод моладзі з-за грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных праблем, разгортвання барацьбы з нацыянал-дэмакратамі. У маладзёжным асяроддзі назіраўся рост праяў шавінізму, антысемітызму і нацыянальнай адасобленасці. Адбыўся адыход ад ажыццяўлення спецыяльнай нацыянальна-культурнай працы ў асяроддзі моладзі нацыянальных меншасцей. Беларусізацыя ў ЛКСМБ з 1929 г. пачала слабець і з 1934 г. не ажыццяўлялася як палітычная кампанія.

Чацвёрты ахоплівае 1935–1939 гг. і вызначаецца развіццём нацыянальна-культурнай працы сярод юнакоў і дзяўчат у напрамку ўмацавання інтэрнацыяналізму. Але толькі напрыканцы вызначанага перыяду пад уплывам кампартыі камсамол значна паглыбіў працу па выхаванні маладога пакалення ў духу інтэрнацыяналізму. Пры гэтым беларуская мова захоўвала дастаткова трывалыя пазіцыі ў маладзёжным асяроддзі.

У цэлым, па нашых падліках, камсамольскія структуры Савецкай Беларусі ў разгледжаны перыяд правялі 105 значных акцый, накіраваных на развіццё нацыянальна-культурнага жыцця і ўкараненне інтэрнацыяналізму ў маладзёжным асяроддзі.

У пачатку 1920-х гг. камсамольцы Савецкай Беларусі вялі антырэлігійную прапаганду пераважна ў асяроддзі яўрэйскай моладзі, што тлумачыцца колькаснай перавагай у складзе саюза яўрэяў. Толькі з 1923 г. камсамольцы пачалі праводзіць сістэматычную антырэлігійную агітацыю сярод насельніцтва, але пераважна фармальна. Адпаведнае выхаванне маладога пакалення вялося эпізадычна. Такое становішча дазваляла духавенству розных канфесій весці плённую рэлігійную працу ў маладзёжным асяроддзі. Нават камсамольцы ўдзельнічалі ў рэлігійных абрадах. Актывізацыя з 1925 г. наступлення камсамола на рэлігію выклікала ідэалагічнае супрацьдзеянне з боку духавенства і ўзмацненне рэлігійных і антыкамсамольскіх настрояў сярод шэрага груп моладзі. Дзейнасць рэлігійных арганізацый стала значнай перашкодай для пашырэння ўплыву ЛКСМБ сярод моладзі нацыянальных меншасцей. Пік іх даволі паспяховай дзейнасці па пашырэнні ўплыву на моладзь прыпаў на 1928–

1929 гг. У той жа час камсамольскія арганізацыі пасіўнічалі і слаба супрацьстаялі рэлігійным уплывам у маладзёжным асяроддзі, мала надавалі ўвагі ячэйкам Саюза бязбожнікаў. Праявы рэлігійнасці адзначаліся не толькі ў асяроддзі шараговых камсамольцаў, але і нават сярод актывістаў саюза. Увогуле ў ЛКСМБ назіраліся супрацьлеглыя ваганні ў ажыццяўленні палітыкі ў адносінах да рэлігійных канфесій. Толькі з 1930 г. камсамольская антырэлігійная праца пачала ўзмацняцца. Пры падтрымцы камсамола колькасна вырас і ўзмацніў практычную дзейнасць СВБ. Аднак у другой палове 1930-х гг. у сувязі з арганізацыйным крызісам ЛКСМБ яго антырэлігійная праца зноў аслабела. Тым не менш, па нашых падліках, камсамольскія структуры за ўвесь разгледжаны перыяд правялі 35 значных акцый і кампаній, накіраваных на пашырэнне антырэлігійнай плыні ў маладзёжным асяроддзі. У выніку мэтанакіраванай антырэлігійнай дзейнасці партыйных, дзяржаўных і камсамольскіх структур у 1930-я гг. атэістычны светапогляд ахапіў пераважную большасць юнакоў і дзяўчат, як мінімум у форме дэкларатыўнага праяўлення. Разам з тым і напрыканцы вызначанага перыяду рэлігійныя ўплывы захоўваліся сярод асобных груп моладзі і нават камсамольцаў.

Улады праводзілі актыўную палітыку па ўключэнні моладзі ў ажыццяўленне культурных пераўтварэнняў. Прычым кіраўніцтва кампартыі і дзяржавы абапіралася ў гэтай справе перш за ўсё на камсамол. Увогуле ажыццяўленне культурнай рэвалюцыі ў асноўным трымалася на энтузіязме маладых людзей, якія ў большасці станоўча яе ўспрымалі і актыўна прапагандавалі.

Разам з тым акрамя камсамольскіх да сярэдзіны 1920-х гг. дзейнічалі і іншыя маладзёжныя культурныя асяродкі, якія ствараліся па ўласнай ініцыятыве юнакоў і дзяўчат, у тым ліку і выхадцамі з Беларусі ў іншых савецкіх рэспубліках.

Камсамол актыўна ўзаемадзейнічаў у сферы культурнай працы з прафсаюзамі. Найбольш эфектыўнай формай культурнай работы сярод маладога пакалення былі гурткі мастацкай самадзейнасці. Дзякуючы мэтанакіраванай падтрымцы з боку партыйных і дзяржаўных органаў, паступова расла сетка камсамольскіх клубаў. З другой паловы 1920-х гг. структуры ЛКСМБ актыўна арганізоўвалі культпаходы, удзельнічалі ў стварэнні, абсталяванні і наладжванні працы культурна-асветных устаноў.

У 1930-я гг. камсамол значна пашырыў свой уплыў у сферы культуры, узрасла зацікаўленасць моладзі мастацкай самадзейнасцю, якая развілася асабліва шырока. У культурна-асветнай дзейнасці сярод насельніцтва актыўны ўдзел прымалі навучэнцы і студэнты. Усё гэта спрыяла росту культурнага ўзроўню юнакоў і дзяўчат.

Партыйныя, дзяржаўныя і камсамольскія органы надавалі вялікую ўвагу арганізацыі ўдзелу моладзі ў развіцці беларускай літаратуры ў вызначаным ідэалагічным рэчышчы. Актыўны ўдзел у выхаванні новай асобы прымалі маладыя пісьменнікі, на творчае станаўленне якіх уплываў камсамол, у першую чаргу праз літаратурнае таварыства “Маладняк”. Нягледзячы на ўсе недахопы, “Маладняк” адыграў вялікую ролю ў збіранні маладзёжных літаратурных сіл і іх прафесійным росце. Але ён аказаўся няздольны задаволіць патрэбы ўсіх маладых літаратараў, што прывяло да стварэння новых літаратурных аб’яднанняў.

Таксама вялікая ўвага надавалася арганізацыі ўдзелу моладзі ў развіцці нацыянальнага тэатральнага мастацтва і беларускай кінематаграфіі ў адпаведнасці з вызначанай кампартыяй ідэалогіяй. Структуры камсамола вялі шырокую працу па папулярызацыі ў маладзёжным асяроддзі тэатральнага мастацтва і кінаматаграфіі. У выніку моладзь не толькі актыўна ўдзельнічала ў драматычных гуртках, самадзейных тэатральных калектывах “Сіняя блуза”, ТРАМах, але і папаўняла шэрагі прафесійных

тэатральных дзеячаў і кінематаграфістаў.

Камсамольцы і несаюзная моладзь актыўна і плённа ўдзельнічалі ў развіцці нацыянальнага выяўленчага і музычнага мастацтваў. Менавіта ў 1920–1930-я гг. пачалі свой творчы шлях цэлы шэраг выдатных беларускіх мастакоў, скульптараў, спевакоў і кампазітараў.

Усяго, па нашых падліках, камсамольскія структуры правялі 62 значныя акцыі і кампаніі, накіраваныя на пашырэнне грамадска-культурнай працы ў маладзёжным асяроддзі, а таксама 165 фізкультурных і спартыўных мерапрыемстваў.

Дзякуючы мэтанакіраванай рабоце партыйных і дзяржаўных органаў, актыўнаму ўдзелу маладога пакалення, асабліва арганізацыйнай дзейнасці камсамола, у Савецкай Беларусі была выхавана маладая генерацыя творчай нацыянальнай інтэлігенцыі, падрыхтаваны каля 146 тыс. фізкультурнікаў і спартсменаў. Разам з тым нельга не адзначыць, што ў выніку рэпрэсій пацярпела значная частка яе прадстаўнікоў.

8. З пачатку 1920-х гг. структруры камсамола вялі даволі актыўную дзейнасць па абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў маладога пакалення і арганізацыі ўдзелу моладзі ў развіцці эканомікі. Але толькі ў 1924 г. ЛКСМБ была створана ўласная разгалінаваная сістэма эканамічнай працы сярод моладзі. Увогуле з сярэдзіны 1924 г. на грунце гаспадарчага ўздыму пачаўся рост актыўнасці маладога пакалення ў эканамічным жыцці. Аднак шырока і трывала забяспечыць правы маладога пакалення ў сацыяльна-эканамічнай сферы камсамолу не ўдавалася.

Нягледзячы на ўсе недахопы і праявы фармалізму, пачатае па ініцыятыве камсамола сацыялістычнае спаборніцтва ў асяроддзі камсамольцаў і несаюзнай моладзі актыўна ўдасканальвалася і паглыблялася, што ўмацоўвала эканоміку. У 1930-я гг. яно перарасло ў БССР у масавы рух працоўных юнакоў і дзяўчат. Пры гэтым калі ў 1933 – жніўні 1935 г. пераважнай яго формай быў ударніцкі рух, то з верасня 1935 г. і да канца вызначанага перыяду – стаханаўскі. Сацыялістычнае спаборніцтва спрыяла фарміраванню ў маладога пакалення такіх важных для грамадства якасцей, як высокі маральны дух, дысцыплінаванасць, адказнасць, калектывізм.

У другой палове 1930-х гг. нарэшце быў наладжаны належны кантроль ЛКСМБ за забеспячэннем выканання працоўнага заканадаўства ў адносінах да падлеткаў. Дзякуючы мэтанакіраванай працы камсамола, паступова раслі заробкі і паляпшаліся побытавыя ўмовы жыцця моладзі. Значнае паляпшэнне яе сацыяльна-эканамічнага становішча адбылося напрыканцы 1930-х гг.

Распаўсюджанай формай прафесійнай падрыхтоўкі моладзі было навучанне на вытворчасці. З-за распаўсюджанасці дробных прадпрыемстваў асноўнай формай працоўнага навучання з'яўлялася індывідуальнае вучнёўства. Работа па навучанні юнакоў і дзяўчат на прадпрыемствах каардынавалася камсамольскімі арганізацыямі. Пры актыўным удзеле структур камсамола ўдасканальвалася заканадаўства аб навучанні на прадпрыемствах. Але часта яго нормы не вытрымліваліся, бо адсутнічаў належны кантроль з боку дзяржаўных органаў, структур прафсаюзаў і камсамола. Толькі ў 1930-я гг. сітуацыя карэнным чынам палепшылася.

Адной з самых складаных і балючых сацыяльных праблем моладзі Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. з'яўлялася беспрацоўе. Яно фактычна расло ўвесь азначаны перыяд, у першую чаргу за кошт малодшых узростаў, якія раней не працавалі. Таму камсамольскія структуры шмат увагі надавалі барацьбе з маладзёжным беспрацоўем. Аднак толькі з пашырэннем прамысловага будаўніцтва ў выніку ажыццяўлення палітыкі індустрыялізацыі праблема маладзёжнага беспрацоўя ў пачатку 1930-х гг. была вырашана.

Нягледзячы на цяжкасці і складанасці, камсамольскія структуры надавалі значную ўвагу маніторынгу стану здароўя працоўнай моладзі. З удзелам іх былі створаны юнсекцыі пры цэнтральным апараце НКАЗ і мясцовых аддзелах аховы здароўя, праводзіліся медагляды працуючых юнакоў і дзяўчат, прапагандаваўся здаровы лад жыцця. Прыярытэт пры правядзенні мерапрыемстваў па ахове здароўя юнакоў і дзяўчат аддаваўся камсамольцам і рабочай моладзі ва ўзросце да 20 гадоў. Увогуле, нягледзячы на шэраг дасягненняў у практычнай рабоце па медыка-санітарным абслугоўванні моладзі, у другой палове 1920-х гг. захоўваліся значныя праблемы ў справе аховы здароўя юнакоў і дзяўчат, звязаныя галоўным чынам з недахопам матэрыяльных сродкаў. У першай палове 1930-х гг. таксама далёка не ўсе мерапрыемствы па аздараўленні моладзі належным чынам выконваліся з-за адсутнасці неабходнага кантролю. Толькі з другой паловы 1930-х гг., у значнай ступені дзякуючы мэтанакіраванай дзейнасці камсамольскіх структур, правядзенне медаглядаў працоўнай моладзі стала масавым і добраарганізаваным.

Структуры камсамола Савецкай Беларусі вялі мэтанакіраваную працу па ліквідацыі дзіцячай і падлеткавай беспрытульнасці, барацьбу з асацыяльнымі з'явамі ў маладзёжным асяроддзі. Моладзь таксама ўдзельнічала ў барацьбе з беззаконнасцю і бюракратызмам праз узаемадзеянне з органамі РСІ і дзейнасць "лёгкай кавалерыі". Аднак праца "лёгкіх кавалерыстаў" характарызавалася перыядычнымі спадамі і ўздымамі. Тым не менш у выніку плённага ўзаемадзеяння структур камсамола і дзяржаўных органаў у канцы 1930-х гг. злачыннасць і асацыяльныя з'явы сярод моладзі значна зменшыліся.

Па нашых падліках, за вызначаны перыяд камсамолам Савецкай Беларусі быў арганізаваны цэлы шэраг буйных акцый: 80 – па забеспячэнні сацыяльна-эканамічных правоў маладога пакалення; 15 – па арганізацыі падрыхтоўкі на прадпрыемствах і ва ўстановах работнікаў з ліку юнакоў і дзяўчат; 23 – па барацьбе з беспрацоўем моладзі; 30 – па ахове здароўя маладых працоўных; 46 – па пераадоленні асацыяльных з'яў у маладзёжным асяроддзі. У выніку мэтанакіраванай працы структур камсамола былі дасягнуты значныя станоўчыя зрухі па ўсіх вышэйадзначаных напрамках.

На працягу ўсяго вызначанага перыяду кіраўніцтва краіны накіроўвала тысячы камсамольцаў на вырашэнне разнастайных складаных пытанняў прамысловага развіцця, мабілізоўвала іх і несаюзную моладзь на будаўніцтва новых прамысловых аб'ектаў, а таксама ў розныя галіны прамысловасці як БССР, так і іншых рэгіёнаў СССР. У пераважнай большасці юнакі і дзяўчаты рэспублікі з вялікім энтузіязмам адгукаліся на адпаведныя заклікі.

Камсамольскія структуры ажыццяўлялі працу па арганізацыі падрыхтоўкі з ліку юнакоў і дзяўчат кваліфікаваных кадраў работнікаў для прамысловасці. Асаблівая ўвага пры гэтым надавалася прафесійнаму навучанню падлеткаў непасрэдна на прамысловых прадпрыемствах.

Па нашых падліках, у азначаны перыяд камсамолам Савецкай Беларусі былі арганізаваны 184 значныя акцыі, накіраваныя на мадэрнізацыю айчыннай прамысловасці і забеспячэнне актыўнага ўдзелу маладога пакалення ў індустрыяльным будаўніцтве. З іх толькі 25 не дасягнулі пастаўленых мэт з-за крызісу кіравання ўнутры ЛКСМБ і перагружанасці яго камітэтаў і ячэек іншымі надзённымі справамі. Агульная большасць камсамольскіх ініцыятыў выклікала шырокі грамадскі рэзананс і падтрымку падрастаючага пакалення. Увогуле юнакі і дзяўчаты адыгралі велізарную ролю ў паспяховым правядзенні палітыкі індустрыялізацыі, стварэнні магутнай айчыннай прамысловасці, паскарэнні прамысловага развіцця БССР.

З пачаткам новай эканамічнай палітыкі савецкія ўлады на вёсцы актыўна сталі

прыцягваць маладое пакаленне да ажыццяўлення яе мерапрыемстваў. Асноўным рухавіком у гэтай справе выступалі арганізацыі камсамола. Камсамольцы таксама дапамагалі ўладам упарадкаваць землекарыстанне, аказвалі ўсебаковую дапамогу маламаёмасным сялянам і сем'ям чырвонаармейцаў, актыўна ўдзельнічалі ў пасяўных кампаніях, меліярацыйных работах, вялі працу па ўкараненні ў сельскую гаспадарку навуковых рэкамендацый і перадавога вопыту. З 1923 г. пры вясковых ячэйках камсамола пачалося стварэнне сельскагаспадарчых гурткоў, у працу якіх былі ўцягнуты тысячы юнакоў і дзяўчат. Формы ўдзелу структур ЛКСМБ у гаспадарчым жыцці сяла з кожным годам рабіліся ўсё больш разнастайнымі. Павялічвалася дапамога сельскім камсамольцам з боку іх гарадскіх таварышаў.

У дзейнасці камсамола значная ўвага адводзілася развіццю калектыўных формаў вясковага гаспадарання. У першай палове 1920-х гг. асноўная ўвага ў гэтай справе надавалася саўгасам. У выніку ў іх паступова павялічвалася колькасць маладых работнікаў. Пры гэтым вельмі слабым быў удзел камсамольцаў і несаюзнай моладзі ў іншых калектыўных формах арганізацыі сельскай гаспадаркі.

У другой палове 1920-х гг. праца арганізацый ЛКСМБ па ўзняцці культуры гаспадарання ў асноўным яшчэ ажыццяўлялася ў напрамку індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Дзейнасць саюза па калектывізацыі і вытворчым каапераванні была хаатычнай і няўзгодненай з мясцовымі ўладамі. Камітэты і ячэйкі саюза дапамагалі ствараць МТС, рыхтаваць з моладзі кадры сельскіх механізатараў. Па ініцыятыве камсамольцаў збіраліся сродкі на закупку сельскагаспадарчых машын і прылад. Аднак уся гэта праца адбывалася ў выглядзе кампаній без належнага замацавання і ўкаранення. Напрыканцы 1920-х гг. у ЛКСМБ выразна праявіліся супрацьлеглыя падыходы ў адносінах да правядзення калектывізацыі. З аднаго боку, шэраг АК, РК і ячэек саюза скажалі лінію кампартыі ў калгасным будаўніцтве праз яго штучнае стымуляванне. З другога боку, унутры арганізацый ЛКСМБ актывізавалася праслойка, якая супрацьдзейнічала калектывізацыі.

Толькі ў 1930-я гг. пад ціскам ЦК ВЛКСМ структуры ЛКСМБ у сваёй дзейнасці на вёсцы пачалі аддаваць прыярытэт працы ў калгасах. Удзел камсамольскіх камітэтаў і ячэек у калектывізацыі паступова павялічваўся, як і працэнт камсамольцаў у калгасах і іх кіраўніцтве. Пашыралася дзейнасць арганізацый камсамола па развіцці саўгасаў, МТС і МТМ. Новай формай удзелу маладога пакалення ва ўдасканаленні сельскагаспадарчай вытворчасці стала арганізацыя па ініцыятыве ЦК камсамола рэспублікі пры камітэтах саюза маладзёжных сельскагаспадарчых станцый. У выніку з сярэдзіны 1930-х гг. камсамольцы і несаюзная моладзь займалі значнае месца ў развіцці сельскай гаспадаркі і выкананні ўсіх гаспадарчых кампаній на сяле.

Па нашых падліках, за перыяд, які разглядаецца намі, камсамол Савецкай Беларусі правёў 229 значных акцый, накіраваных на мадэрнізацыю сельскай гаспадаркі і забеспячэнне актыўнага ўдзелу ў гэтым працэсе маладога пакалення. З іх 161 была рэалізавана, хоць і з рознай ступенню паспяховасці, і толькі 68 пацярпелі няўдачу з-за крызісу кіравання ўнутры ЛКСМБ і перагружанасці яго камітэтаў і ячэек іншымі надзённымі справамі. У цэлым моладзь унесла вялікі ўклад у развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці БССР.

9. Дзяржаўныя органы, структуры кампартыі, прафсаюзы і камсамольскія арганізацыі з пачатку 1920-х гг. ажыццяўлялі мэтанакіраваную працу па развіцці маладзёжнага фізкультурнага руху, выкарыстоўваючы яго не толькі ў мэтах умацавання здароўя юнакоў і дзяўчат, але і для ўзмацнення абараназдольнасці краіны і выхавання падрастаючага пакалення ў духу патрыятызму.

Разам з тым да сярэдзіны 1930-х гг. маладзёжная фізкультура слаба развівалася на вёсцы, ды і ў горадзе маладое пакаленне ўцягвалася ў яе павольна. Адмоўна адбівалася на гэтым працэсе саперніцтва паміж кіраўніцтвам ЛКСМБ і прафсаюзаў у справе разгортвання фізкультурнай працы сярод моладзі. З-за недахопу матэрыяльных сродкаў марудна павялічвалася колькасць планерыстаў, авіямадэлістаў і аэраклубаў, а таксама юнакоў і дзяўчат, якія здалі нормы абаронных комплексаў і ваенна-тэхнічны экзамен. Толькі з другой паловы 1930-х гг. у выніку падтрымкі і дапамогі з боку партыйных і дзяржаўных органаў арганізацыі камсамола і Асаавіяхіма БССР разгарнулі інтэнсіўную працу па развіцці масавага маладзёжнага ваенна-спартыўнага руху. У выніку значна павялічылася колькасць фізкультурных і спартыўных мерапрыемстваў з удзелам моладзі, вырасла колькасць юнакоў і дзяўчат, якія здалі нормы абаронных комплексаў. Увогуле, калі ў пачатку 1920-х гг. фізкультурай і спортам у Савецкай Беларусі займаліся сотні маладых людзей, то напрыканцы 1930-х гг. – сотні тысяч.

Значная ўвага ў дзейнасці структур камсамола Савецкай Беларусі адводзілася ваенна-шэфскай працы па розных напрамках. У шэфства ўцягвалася і несаюзная моладзь. Аднак да другой паловы 1930-х гг. існавала хранічная запазычанасць па шэфскіх узносах, слаба падтрымлівалася непасрэдная сувязь з падшэфнымі структурамі, адсутнічала якасная прапаганда шэфства. Тым не менш кіраўніцтва ЛКСМБ пры падтрымцы партыйных і дзяржаўных органаў вяло мэтанакіраваную працу па паляпшэнні ваенна-шэфскай дзейнасці. З'яўляліся новыя формы шэфства над вайсковымі часткамі, што давала станоўчыя вынікі. Асабліва актыўна развівалася камсамольскае шэфства над лінкорам "Парижская коммуна", авіячасткамі БВА і пагранвойскамі. У выніку ў другой палове1930-х гг. арганізацыя ваенна-шэфскай працы значна палепшылася, шырока разгарнулася шэфства камсамольскіх арганізацый над асобнымі вайсковымі часткамі і ўзаемадзеянне з імі ў справе навучання моладзі ваенным спецыяльнасцям.

Падрыхтоўка маладога пакалення да абароны Радзімы, ваенна-патрыятычнае выхаванне юнакоў і дзяўчат з'яўлялася адным з важнейшых напрамкаў працы камсамола і абаронных таварыстваў у Савецкай Беларусі.

У цэлым 1920-я гг. былі часам пошуку аптымальных форм маладзёжнай абаронна-масавай працы. З 1927 г. ключавую ролю ў ажыццяўленні падрыхтоўкі маладога пакалення да абароны Айчыны адыгрывалі арганізацыі ЛКСМБ і Асаавіяхіма. Разгорнутая імі актыўная агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць значна павялічыла зацікаўленасць маладых людзей у атрыманні неабходных вайсковых ведаў. Правядзенне ваенізаваных манеўраў і паходаў садзейнічала павелічэнню аўтарытэту камсамола ў маладзёжным асяроддзі, росту дысцыплінаванасці камсамольцаў, спрыяла ўзмацненню ўдзелу юнакоў і дзяўчат у працы Асаавіяхіма. Але дамагчыся масавага ахопу моладзі ваеннай вучобай яшчэ не ўдалося. Больш шырокаму і якаснаму разгортванню абаронна-масавай працы перашкаджалі абмежаваныя матэрыяльныя магчымасці дзяржавы і грамадскіх арганізацый, слабая выканаўчая дысцыпліна, імкненне да колькасных, а не якасных паказчыкаў.

Значнае ўзмацненне ваенна-патрыятычнай працы з маладым пакаленнем

адбылося ў 1930-я гг. Дзякуючы падтрымцы з боку партыйных і дзяржаўных органаў, арганізацыі ЛКСМБ і Асаавіяхіма, разгарнулі інтэнсіўную працу па масавым вайсковым навучанні без адрыву ад вытворчасці. Было наладжана ўзаемадзеянне камсамола з Чырвоным Крыжам. Асабліва эфектыўнай формай ваенна-патрыятычнага выхавання ў гэтыя гады сталі ваенізаваныя паходы, вучэнні і гульні. Яны выразна прадэманстравалі вялікі патрыятычны ўздым і гатоўнасць юнакоў і дзяўчат да абароны Айчыны. Шырока распаўсюдзіліся камсамольскія сацыялістычныя спаборніцтвы па арганізацыі абароннай работы. З другой паловы 1930-х гг. змест абаронна-масавай работы ЛКСМБ паглыбіўся, адрозніваўся большым размахам і разнастайнасцю. У выніку ў ваенна-патрыятычную працу былі ўцягнуты сотні тысяч юнакоў і дзяўчат.

Паводле нашых падлікаў, за вызначаны перыяд камсамолам Савецкай Беларусі быў арганізаваны цэлы шэраг буйных акцый: 165 – фізкультурных і спартыўных, 48 – па падрыхтоўцы дапрызыўнікаў да вайсковай службы, 53 – ваенна-патрыятычнага напрамку і 39 – ваенна-шэфскага, 19 – па накіраванні здольнай моладзі ў ваенна-навучальныя ўстановы. У выніку пры непасрэдным удзеле беларускіх камсамольскіх структур былі падрыхтаваны каля 146 тыс. фізкультурнікаў і спартсменаў, каля 10 тыс. афіцэраў, звыш 18 тыс. аўтамабілістаў і 35 тыс. кавалерыстаў, каля 26 тыс. парашутыстаў і 8 тыс. планерыстаў, больш за тысячу лётчыкаў; пачатковую ваенную падрыхтоўку прайшлі каля 380 тыс. дапрызыўнікаў; у Асаавіяхім былі ўцягнуты каля 247 тыс. юнакоў і дзяўчат, нормы комплексаў "Варашылаўскага стралка" здалі каля 109 тыс. маладых людзей, "Гатовы да працы і абароны" – каля 137 тыс., "Гатоў да супрацьпаветранай і проціхімічнай абароны" – каля 125 тыс., "Готоў да санітарнай абароны" – каля 31 тыс.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ

### Манаграфіі

1. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным будаўніцтве Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч. – Мінск: Беларуская навука, 2020. – 730 с.

### Раздзелы ў калектыўных манаграфіях

2. Данилович, В. В. Участие молодёжи в укреплении белорусского государства / В. В. Даніловіч // История белорусской государственности. – Т. 3. Белорусская государственность от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.). – Мінск: Беларуская навука, 2019. – 639 с. – С. 409–485.

### Артыкулы ў навуковых выданнях

3. Даніловіч, В. Ажыццяўленне камсамолам нацыянальнай працы сярод польскай моладзі Савецкай Беларусі ў 1920-я гг. / В. Даніловіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 34 / рэдкал.: А. А. Каваленя, В. В. Даніловіч і інш. Мінск: "Беларуская навука", 2019. – С. 115–119.
4. Даніловіч, В. В. Арганізацыі беларускай моладзі Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2. Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2015. – № 2. – С. 65–74.

5. Даніловіч, В. В. Арганізацыя палітычнай асветы моладзі Савецкай Беларусі ў 1921–1928 гг. / В. В. Даніловіч // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2016. – № 1. – С. 14–20.
6. Даніловіч, В. В. Маладзёжнае беспрацоўе ў Савецкай Беларусі ў 1920-я гады і барацьба з ім / В. В. Даніловіч // Гісторыя і грамадазнаўства. – 2015. – № 10. – С. 3–14.
7. Даніловіч, В. В. Маніторынг стану здароўя моладзі і арганізацыя мерапрыемстваў па яе аздараўленні ў Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Ученые записки УО "ВГУ им. П.М. Машерова": сборник научных трудов. – Т. 20. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2015. – С. 80–88.
8. Даніловіч, В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь у пачатку 1920-х гг. / В. Даніловіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 23 / рэдкал.: А. А. Каваленя, В. В. Даніловіч і інш. Мінск: ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі", 2007. – С. 15–21.
9. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь напярэдадні беларусізацыі / В. В. Даніловіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2009. – № 3. – Серыя гуманітарных навук. – С. 62–70.
10. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці ССРБ у 1922 г. / В. В. Даніловіч // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. – 2007. – № 2. – Серыя 2. – С. 8–12.
11. Даніловіч, В. В. Моладзь у індустрыяльным будаўніцтве БССР (1928–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2017. – № 1. – Серыя гуманітарных навук. – С. 33–48.
12. Даніловіч, В. В. Моладзь у кааператыўным руху Савецкай Беларусі 20 – 30-х гадоў XX стагоддзя / В. В. Даніловіч // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2015. – № 1. – С. 2–7.
13. Даніловіч, В. В. Моладзь у прамысловасці Савецкай Беларусі ў гады ажыццяўлення новай эканамічнай палітыкі / В. В. Даніловіч // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. Гуманитарные науки: история, филология, философия. – 2016. – № 4. – С. 30–35.
14. Даніловіч, В. В. Моладзь у прафсаюзным руху Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 30 / рэдкал.: А. А. Каваленя, В. В. Даніловіч і інш. Мінск: "Беларуская навука", 2015. – С. 161–170.
15. Даніловіч, В. В. Моладзь у сацыяльна-эканамічным жыцці Савецкай Беларусі ў пачатку 1920-х гг. / В. В. Даніловіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2010. – № 3. – Серыя гуманітарных навук. – С. 58–66.
16. Даніловіч, В. В. Моладзь у сельскай гаспадарцы Савецкай Беларусі ў час разгортвання масавай калектывізацыі (1928–1930 гг.) / В. В. Даніловіч // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2016. – № 1. – С. 11–21.
17. Даніловіч, В. В. Моладзь у сельскагаспадарчай вытворчасці Савецкай Беларусі (1921–1927 гг.) / В. В. Даніловіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2016. – № 1. – Серыя гуманітарных навук. – С. 29–39.
18. Данилович, В. В. Молодёжь в органах власти и управления Советской Беларуси 20-х – 30-х годов XX века / В. В. Данилович // Известия Самарского научного центра Российской академии наук. – 2014. – № 3 (2). – С. 459–467.
19. Данилович, В. Молодёжь в социально-экономической жизни Советской Социалистической Республики Беларусь на начальном этапе новой экономической политики / В. Данилович // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 24 / рэдкал.:

А. А. Каваленя, В. В. Даніловіч і інш. Мінск: ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі", 2008. – С. 94–100.
20. Данилович, В. В. Молодёжь в экономической жизни Советской Беларуси в 1921–1939 гг. / В. В. Данилович // Исторический журнал: научные исследования – 2015. – № 6. – С. 778–790.
21. Данилович, В. В. Молодёжь и общественно-политическая жизнь Советской Социалистической Республики Беларусь начала 1920-х годов / В. В. Данилович // Историческое пространство. Проблемы истории стран СНГ. – 2008. – № 1-4. – С. 139–149.
22. Данилович, В. В. Начало НЭПа и новое поколение в Советской Беларуси (проблема определения ориентиров) / В. В. Данилович // Европейские сравнительно-исторические исследования. Вып. 3. История и сообщества / Отв. ред. А. А. Улунян. – Москва: ИВИ РАН, 2010. С. 342–352.
23. Данилович, В. В. Социальное положение молодёжи Советской Беларуси в 1921–1939 гг. / В. В. Данилович // Человеческий капитал. – 2015. – № 1. – С. 14–19.
24. Даніловіч, В. В. Удзел моладзі ў грамадскім жыцці Савецкай Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. / В. В. Даніловіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2015. – № 1. – Серыя гуманітарных навук. – С. 31–38.
25. Даніловіч, В. В. Удзел моладзі ў нацыянальна-культурным жыцці Савецкай Беларусі (1921–1939) / В. В. Даніловіч // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2018. – № 4. – С. 19–27.
26. Даніловіч, В. Удзел моладзі ў палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. Даніловіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 31 / рэдкал.: А. А. Каваленя, В. В. Даніловіч і інш. Мінск: "Беларуская навука", 2016. – С. 87–99.
27. Даніловіч, В. В. Удзел моладзі ў прафсаюзным руху Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2015. – № 2. – С. 4–11.
28. Даніловіч, В. В. Удзел моладзі ў сацыяльна-эканамічным жыцці ССРБ у 1922 г. / В. В. Даніловіч // Веснік Палескага дзяржаўнага універсітэта. – 2009. – № 1. – Серыя грамадскіх і гуманітарных навук. – С. 37–41.
29. Даніловіч, В. В. Уплыў асацыяльных з'яў на моладзь Савецкай Беларусі і барацьба з ім (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2015. – № 2. – С. 23–34.
30. Даніловіч, В. В. Яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі Савецкай Беларусі (1921–1929 гг.) / В. В. Даніловіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 2015. – № 2. – Серыя гуманітарных навук. – С. 54–63.

**Артыкулы ў навуковых зборніках і іншых выданнях**

31. Даніловіч, В. В. Ажыццяўленне камсамолам нацыянальнай працы сярод яўрэйскай моладзі Савецкай Беларусі ў 1920-я – пачатку 1930-х гг. / В. В. Даніловіч // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава. Зб. навук. арт. / пад рэд. І. Ф. Кітуркі і інш. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2021. – С. 19–23.
32. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным жыцці Савецкай Беларусі 1921–1939 гг.: гістарыяграфія праблемы / В. В. Даніловіч // Гістарыяграфія і крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі: традыцыі і навацыі. Зб. навук. арт. / рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – С. 29–46.
33. Даніловіч, В. В. Моладзь у сацыяльна-эканамічным жыцці ССРБ у 1922 г. / В. В. Даніловіч // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады

даследавання: Зб. навук. арт.; Пад рэд. М. М. Забаўскага, А. А. Кавалені, Г. А. Космача, А. М. Лютага, У. В. Тугая. – Мінск: БДПУ, 2004. – С. 177–182.
34. Даніловіч, В. Моладзь у спажывецкай каапераціі Савецкай Беларусі ў 1920–1930-я гады / В. В. Даніловіч // Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі: зб. навук. арт. / рэдкал.: А. А. Каваленя і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – С. 387–392.
35. Данилович, В. В. Общественная деятельность молодежи Советской Беларуси межвоенного периода / В. В. Даніловіч // Столетие Революции 1917 года в России. Научный сборник. В 2-х ч. Ч. 2. Революция 1917 года в России – в истории и историографии стран ближнего зарубежья / Отв. ред. И. И. Тучков. – Москва: Изд-во АО "РДП", 2018. – С. 58–77.
36. Даніловіч, В. В. Структура і склад КСМБ у 1923 г. / В. В. Даніловіч // Актуальныя пытанні сучаснай навукі: зб. навук. прац / Пад рэд А. А. Кавалені і інш.; адк. рэд. В. В. Даніловіч. – Мінск: БДПУ, 2006. – С. 15–18.

**Артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый**

37. Даніловіч, В. В. Ажыццяўленне камсамолам нацыянальна-культурнай працы сярод латышскай моладзі савецкай Беларусі ў 1920-я гг. / В. В. Даніловіч // От Версаля и Веймара до образования двух Германий (ФРГ и ГДР, 1919–1949 гг.): актуальные вопросы исторической германистики, отечественной и всеобщей истории, геополитики и международных отношений, социально-гуманитарных наук и права: материалы международной научной конференции, Витебск, 3–4 октября 2019. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2019. – С. 205–206.
38. Даніловіч, В. В. Гістарыяграфія маладзёжнага руху Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. В. Даніловіч // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі: Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 28 лістапада 2003 г. У 3 ч. Ч. 2 / Пад рэд. У. В. Тугая (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БДПУ, 2003. – С. 414–418.
39. Данилович, В. В. Деятельность комсомола Советской Беларуси в сфере культуры (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Российская молодежь: от комсомола к современным формам политической организации. Материалы межрегиональной научно-практической конференции (Новосибирск, 30–31 октября 2018 года) / Редкол.: В. И. Козодой и др. – Новосибирск: Параллель, 2018. – С. 40–51.
40. Даніловіч, В. В. Дзейнасць КСМБ па ўмацаванні дзяржаўнасці ССРБ у сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя: Матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 18–19 крас. 2003 г. / Пад рэд. П. І. Брыгадзіна, А. А. Кавалені, У. Ф. Ладысева, В. Ф. Касовіча. – Мінск: БДПУ, 2004. – С. 81–82.
41. Даніловіч, В. В. Метадалагічныя асаблівасці вывучэння маладзёжнага руху Беларусі ў 1921–1939 гг. / В. В. Даніловіч // Проблемы методологии исследований истории Беларуси: материалы Международ. науч. конф. (Минск, 26–27 октября 2006 г. / Под ред. А. А. Ковалени, В. В. Даниловича и др. – Минск: Белорусская наука, 2008. – С. 23–24.
42. Даніловіч, В. В. Моладзь Полаччыны і Віцебшчыны ў грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі 1921–1939 гг. / В. В. Даніловіч // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў. Зб. навук. арт. III міжнар. навук.-практ. канф., Полацк, 14–15 крас. 2016 г.: у 2 ч. / пад агул. рэд.: Д. У. Дука, У. А. Лобача, А. І. Корсак. – Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2016. – С. 14–21.
43. Даніловіч, В. В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці Мінска пачатку 1920-х гадоў / В. В. Даніловіч // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада): Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 7 – 9 вер. 2007 г. / Пад рэд.

А. А. Кавалені (адк. рэд.), А. А. Скеп'ян і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – С. 284–290.
44. Даніловіч, В. В. Моладзь у нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве БССР у 1920-я гады / В. В. Даніловіч // Фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ва ўмовах геапалітычных зрухаў XX ст.: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 ліст. 2018 г. / рэдкал. А. Д. Кароль і інш. – Мінск: БДУ, 2018. – С. 11–20.
45. Даніловіч, В. В. Моладзь у органах дзяржаўнага кіравання Савецкай Беларусі (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Белорусская государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.) материалы Респ. науч.-теорет. конф., Минск, 29 июня 2017 г. / под ред. А. В. Касовича (отв. ред.) и др. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 91–94.
46. Даніловіч, В. В. Моладзь у рэлігійным жыцці савецкага Беларускага Падзвіння (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў [Электронны рэсурс]: электрон. зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. / Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; пад агул. рэд.: А. І. Корсак. – Наваполацк: ПДУ, 2018. – С. 4–14.
47. Даніловіч, В. В. Палітыка-ідэалагічныя фактары фарміравання грамадзянскай культуры моладзі Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь у 1922 г. / В. В. Даніловіч // Формирование гражданской культуры молодёжи в условиях интеграции Республики Беларусь в европейское образовательное пространство: Материалы междунар. науч. конф., Витебск, 8–9 декабря 2004 г. / Под ред. Раковой Н. А. (отв. ред.) и др. – Витебск: Издательство УО "ВГУ им. П. М. Машерова", 2004. – С. 41–44.
48. Даніловіч, В. В. Рэалізацыя дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў грамадскім жыцці ССРБ у пачатку 1920-х гг. / В. В. Даніловіч // Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя з дня ўтварэння БССР): Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 18 снеж. 2008 г. / Пад рэд. А. А. Кавалені (старшыня), М. У. Смяховіча і інш. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2009. – С. 72–76.
49. Даніловіч, В. В. Рэалізацыя дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай маладзёжнай палітыкі на Гарадоччыне ў сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Гарадоччына ўчора, сёння, заўтра: Матэрыялы І Гарадоцкіх краязнаўчых чытанняў, Гарадок, 26 кастрычніка 2007 г. / Пад рэд. А. М. Дарафеева (адк. рэд.), Т. М. Іванова, Ю. Э. Самавічуце. – Гарадок: УК "Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей", 2008. – С. 59–62.
50. Даніловіч, В. В. Рэалізацыя дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай маладзёжнай палітыкі на Мазыршчыне ў сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Гомельщина в событиях 1917–1945 гг.: Материалы науч.-практ. конф., Гомель, 27 ноября 2007 г. / Под ред. А. А. Ковалени, А. М. Литвина и др. – Гомель: БелГУТ, 2007. – С. 67–69.
51. Даніловіч, В. В. Сацыяльна-эканамічнае становішча моладзі ССРБ у сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Гістарычнае пазнанне – важнейшая ўмова фарміравання светапогляду настаўнікаў XXI стагоддзя: Матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 6 снежня 2002 г. / Пад навук. рэд. А. А. Кавалені і В. Ф. Касовіча. – Мінск: БДПУ, 2003. – С. 119–121.
52. Даніловіч, В. В. Становішча Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі ў сакавіку – снежні 1921 г. / В. В. Даніловіч // Октябрь 1917 года в судьбе мировой цивилизации (к 90-летию Октябрьской революции): материалы Международ. науч.-практ. конф., Минск, 2 ноября 2007 г. / Под ред. М. П. Касцюка, Н. В. Смеховича. – Мінск: Белорусская наука, 2008. – С. 221–224.

53. Данилович, В. В. Участие молодёжи в процессе укрепления белорусской советской государственности (1921–1939 гг.) / В. В. Даніловіч // 1917 год у гістарычных лёсах Беларусі: зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Мінск, 30 лістап. – 1 снеж. 2017 г. / рэдкал.: А. Д. Кароль (старш.) і інш. – Мн.: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2017. – С. 209–215.
54. Даніловіч, В. В. Яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі на Гомельшчыне ў 1921–1929 гг. / В. В. Даніловіч // Проблемы рационального использования природных ресурсов и устойчивое развитие Полесья: сб. докл. Междунар. науч. конф. (Минск, 14–17 сент. 2016 г.). В 2 т. Т. 2 / Редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) и др. – Минск: Беларуская навука, 2016. – С. 506–509.